Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

25 ЛЮТАГА 2009 г.
СЕРАДА
№ 35
(26393)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# Праблем з папаўненнем даходнай часткі бюджэту ў Беларусі няма

**Праблем з папаўненнем даходнай часткі бюджэту ў Беларусі няма. Аб гэтым заявіў журналістам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

«За два месяцы катастрофы з бюджэтам няма. Нават пайшлі ўжо маленькія паляпшэнні ў эканоміцы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Калі ўзяць бюджэт са сваімі фондамі, то мы ўсяго на Br200-300 млрд спрацавалі горш, чым у мінулым годзе».

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава выканае ўсе сацыяльныя абавязацельствы, якія былі ўстаноўлены ў пачатку года. Галоўная задача — утрымацца ў першым паўгоддзі на тым узроўні, на якім знаходзімся цяпер. Ён дадаў, што некаторыя сродкі будуць эканоміцца, пераразмяркоўвацца.

У красавіку Прэзідэнт мае намер падвесці вынікі работы рэальнага сектара эканомікі за першы квартал. «Мы ўжо будзем мець нейкія вынікі, бачыць тэндэнцыі, будзем разумець, у якім напрамку і якімі тэмпамі рухацца. Паглядзім, як у цэлым адбіліся тэндэнцыі сусветнага крызісу на нашай эканоміцы», — сказаў ён.

Гаворачы аб рабоце Мінскага маторнага завода, Прэзідэнт адзначыў, што крызіс крыху прытармазіў развіццё прадпрыемства. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ў 2009 годзе выпусціць і прадаць на 2-3 тыс. матораў больш, чым у мінулым годзе. Ён таксама бачыць вялікую перспектыву ў выхадзе прадпрыемства на вытворчасць рухавікоў стандарту Еўра-5.

Прэзідэнт адзначыў, што неабходна адсочваць сітуацыю, і калі ў свеце хутка пойдуць тэндэнцыі паляпшэння эканамічнай сітуацыі, беларускія работнікі вытворчасці павінны на гэта хутка адрэагаваць. Ён дадаў, што ва ўмовах крызісу важна заняць на рынку сваю нішу.

Прэзідэнт Беларусі паставіў задачу да канца першага квартала гэтага года рэалізаваць усё пабудаванае камерцыйнае жыллё.

«Калі бізнэсмены на працягу першага квартала не рэалізуюць пабудаванае ўжо жыллё, то мы яго канфіскуем і прададзім маючым патрэбу, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І няхай радуюцца, калі мы ім заплацім па сабекошце».

«Я бачу, што не здадзены людзям пабудаваныя дамы. Што адбываецца? Насельніцтва чакае танных крэдытаў, каб купіць гэта жыллё, пажадана пад 5—7 працэнтаў. Бізнэсмены ж прытаіліся, думаюць, што дзяржава цяпер укіне пэўную колькасць грошай, і яны зноў па $2-3 тыс. за квадратны метр будуць прадаваць. Гэтага не будзе, — папярэдзіў Прэзідэнт. — Спадзявацца, што яны ад дзяржавы праз ільготнікаў перакладуць сабе ў кішэню грошы, атрыманыя за прададзенае па шалёных цэнах жыллё, не трэба». Гэта жыллё павінна быць прададзена блізка да сабекошту, падкрэсліў ён.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава прадоўжыць выдаваць ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылля пад 5 працэнтаў. Ён адзначыў, што галоўная задача сёння — забяспечыць жыллём малазабяспечаных грамадзян. Усе ж астатнія павінны купляць па існуючых на рынку цэнах. «Мы будзем падтрымліваць тых, што мае патрэбу ў паляпшэнні жылля, і прымусім бізнэс прадаць пабудаванае ўжо жыллё», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, усе рашэнні даведзены да губернатараў, і імі будуць прыняты адпаведныя меры.

Выказаўшы заклапочанасць у сувязі са слабым развіццём будаўнічай галіны, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў бліжэйшы час мае намер удзяліць гэтаму пытанню асаблівую ўвагу.

Сусветны фінансавы крызіс закрануў беларускую эканоміку, паколькі яна экспартаарыентаваная.

«Мы ўсю прадукцыю рэалізуем на экспарт, у тым ліку маторы, абутак, адзенне, сметанковае масла і іншае. Усім прадпрыемствам даведзены паказчыкі экспарту. Менавіта таму сусветны фінансавы крызіс закрануў у цэлым нашу эканоміку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Што датычыцца расійскіх і заходніх крэдытаў, мы іх пакуль выкарыстоўваем на падтрыманне нашай валюты і больш іх нікуды не накіроўваем. Для нас гэта, вядома, вельмі вялікая падтрымка, гэта нас пакуль што выратоўвае, але гэта мізэрна мала. Ніхто нам не дапаможа ў поўным аб'ёме, калі не будзе працаваць эканоміка. Па рабоце маторнага завода мы бачым, што эканоміка пачынае ажываць. У прыватнасці, пайшлі заказы, у сакавіку прадпрыемствы выходзяць на ўзровень мінулага года. Ажыўленне эканомікі адчуваецца і па дзейнасці іншых беларускіх прадпрыемстваў», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што будзе нармальна працаваць эканоміка — будуць і грошы. Паводле яго слоў, крэдыты для Беларусі важныя таксама ў мэтах стварэння «падушкі бяспекі». «Мы павінны быць упэўнены, што заўтра будзе не горш, чым сёння. Таму і венесуэльскія і расійскія крэдыты, і накопленыя золатавалютныя рэзервы, і крэдыты МВФ — гэта вялікая для нас дапамога і падтрымка», — сказаў Прэзідэнт.

Візіт у Мінск генеральнага сакратара Савета Еўрапейскага саюза — Вярхоўнага прадстаўніка па агульнай знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі ЕС Хаўера Саланы будзе садзейнічаць паляпшэнню ўзаемаадносінаў Беларусі і Еўрасаюза і паскорыць збліжэнне насустрач адзін аднаму.

Кіраўнік дзяржавы назваў праведзеныя перагаворы паспяховымі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сустрэча з генеральным сакратаром прайшла на добрым узроўні і завяршылася вельмі пазітыўна. «Вынікі перагавораў добрыя, я імі задаволены, да гэтага мы не маглі разлічваць на такі пазітыўны вынік», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Хаўер Салана з'яўляецца адным з самых вопытных перагаворшчыкаў у знешнепалітычных пытаннях. Паводле слоў беларускага лідара, галоўны вынік праведзеных перагавораў — гэта тое, што Хаўер Салана не паставіў ні адной умовы. На сустрэчы размова ішла аб перспектывах, аб значэнні Беларусі для Еўропы. «Ведаеце, у Еўропе гэта разумеюць, важна, што Хаўер Салана задаволены вынікамі перагавораў. Я вельмі рады гэтаму, значыць, ёсць разуменне нашай пазіцыі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што сусветны фінансавы крызіс многіх у свеце працвярэзіў, многія рэальна пачалі глядзець у будучае. «І Еўропа сваё заўтра без Беларусі сёння не бачыць. Таму я задаволены гэтымі вынікамі, ніякіх дадатковых умоў перад намі не было пастаўлена. Мы самі разумеем, ведаем, што трэба рабіць, што трэба рабіць Еўропе для таго, каб не толькі збліжэць пазіцыі, але і быць добрымі сапраўднымі партнёрамі. Я ніколькі не сумняваюся ў тым, што прыезд Хаўера Саланы палепшыць нашы ўзаемаадносіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Ва Урадзе

# Прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця пераглядацца не будзе...

**Інфляцыя ў краіне па шэрагу як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных фактараў у першым месяцы гэтага года склала 4,1 працэнта, нагадаў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім падводзіліся вынікі работы эканомікі ў студзені, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. «У нас даўно не было такіх крутых віражоў», — заўважыў прэм'ер. Зразумела, што на рост цэнаў паўплывалі і праведзеная дэвальвацыя рубля, і падаражэнне паслуг ЖКГ. Аднак было і так, што пад агульны «шумок» асобныя прадпрыемствы і прадпрымальніцкія структуры «ўзвінчвалі» цэны.**

Праўда, пасля праверак кантрольных органаў «расперазаныя» цэны ўдалося паступова знізіць і вярнуць на ранейшы ўзровень. Разам з тым, адзначыў кіраўнік Урада, сёння асобныя вытворцы прапануюць пакінуць у Беларусі дакрызісныя цэны, а за мяжу прадаваць тавары па больш нізкім кошце. «Такога ў краіне ніколі не будзе, — заявіў прэм'ер. — Цэны ў Беларусі будуць падаючымі і адпавядаць цэнам на знешніх рынках». Паводле яго слоў, адмовіўшыся ад рэгулявання цэнаў па шэрагу пазіцый, «мы вельмі ўважліва будзем прымяняць антыманапольнае заканадаўства ў краіне, на гэта будуць накіраваныя намаганні ўсіх органаў дзяржаўнай улады як у сталіцы, абласных цэнтрах, так і на месцах». І хоць студзеньскі «зачын» у прэм'ера не выклікае асаблівага аптымізму, ён падкрэслівае, што хацелася б, каб па выніках года інфляцыя знаходзілася ў вызначаных параметрах — 9-11 працэнтаў.

Між іншым, калі гутарка зайшла пра падыход да цэнаўтварэння асобных суб'ектаў гаспадарання, Сяргей Сідорскі выказаў сур'ёзныя прэтэнзіі, у прыватнасці, да работы двух аператараў сотавай сувязі. «На працягу студзеня-лютага яны ўзнялі цэны больш як на 18 працэнтаў, — паведаміў ён. — Пры гэтым паслугі імі аказваюцца ў беларускіх рублях, а рэнтабельнасць складае 40 працэнтаў». У сваю чаргу міністр эканомікі Мікалай Зайчанка праінфармаваў прысутных, што міністэрства накіравала пісьмы двум аператарам — VELCOM і МТС, — у якім ім прапанавана перагледзець сваю пазіцыю па павышэнні тарыфаў на 18 працэнтаў і вярнуцца да ранейшых тарыфаў. «Калі гэта не будзе зроблена, — заўважыў міністр, — Мінэканомікі будзе вымушана ўвесці дзяржрэгуляванне, гэта значыць, уключыць гэтых аператараў у пералік манапалістаў».

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

*Над тым, як назваць сваю сядзібу, Ала ПАЛІКАРПУК доўга не думала. Калі вуліца, на якой яна жыве, называецца Зарэчная, то і сядзіба, вядома ж, — «На Зарэчнай вуліцы». Так, назва аднаго з самых папулярных савецкіх фільмаў спалучаецца тут з традыцыйнай беларускай гасціннасцю і адраджэннем народных рамёстваў. Сядзіба знаходзіцца ў Кобрынскім раёне, у старадаўнім урочышчы Дзяршова, у вёсцы Пескі-1. На тэрыторыі сядзібы захавалася хата пачатку XX стагоддзя, пабудаваная ў традыцыях Кобрынскага дойлідства. Цяпер гаспадары наладзілі тут этнаграфічную экспазіцыю. Пры жаданні госці могуць спыніцца і ў ёй. У сядзібы шмат чаго ёсць цікавага, але дзве асаблівасці — галоўныя. Гаспадары прапануюць гасцям нацыянальную беларускую кухню і ладзяць выставы-продажы вырабаў мясцовых майстроў.*

**Сёння, 25 лютага, у галоўным офісе Белаграпрамбанка ў Мінску збяруцца прадстаўнікі Урада, грамадскіх аб'яднанняў, турыстычных арганізацый, а таксама гаспадары вясковых сядзіб і фермерскіх гаспадарак, каб абмеркаваць стан і перспектывы развіцця ў нашай краіне аграэкатурызму. Газета «Звязда» гэтай тэме даўно надае асаблівую ўвагу. Напярэдадні канферэнцыі мы сустрэліся з людзьмі, якія па роду сваёй дзейнасці і закліку душы аналізуюць працэсы, якія адбываюцца ў аграгурызме і садзейнічаюць таму, каб вясковыя міні-гасцініцы сталі штуршком для працвітання вёскі і краіны ў цэлым.**

***Валерыя КЛІЦУНОВА,***
***Старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы»:***

### «НЕ КОЖНЫ МОЖА ГЭТЫМ ЗАЙМАЦЦА»

**— Валерыя, чатыры гады таму вы казалі, што для развіцця аграгурызму неабходныя тры ўмовы: закон, крэдыты і рэклама. Сёння ўсё гэта ёсць, і вясковы турызм у нашай краіне «стрэліў»...**

— Мы тут не адкрылі Амерыкі: у любой еўрапейскай краіне, як толькі з'яўляецца прагрэсіўнае заканадаўства ў галіне аграгурызму, тэмпы яго развіцця набываюць выбуховы характар. Другім важным штуршком, вядома, стала льготнае крэдытаванне.

Сёлета ў каталог, які мы выпускаем сумесна з Белаграпрамбанкам, увайшло 250 сядзіб. Колькасць іх у параўнанні з мінулым годам павялічылася ў два з паловай разы. Гэта тыя сядзібы, якія ўжо гатовы прыняць гасцей. Усяго, па інфармацыі падатковай інспекцыі, зарэгістравана 474 суб'екты аграгурызму. У параўнанні з 2006 годам, калі з'явіўся Указ Прэзідэнта № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь», колькасць сядзіб павялічылася ў 14 разоў!

Цяпер вельмі важна захаваць якасць прадукту. Тэма становіцца высока кан'юнктурнай, падтрымліваецца на самым высокім узроўні, і ў многіх структур узнікае жаданне фарсіраваць развіццё вясковага турызму, рабіць прыгожыя справаздачы. Я вельмі баюся, каб захапленне статыстыкай не пашкодзіла справе. Трэба разумець, што не кожны можа гэтым займацца.

Трэба адчуваць унутраную патрэбу і адпавядаць гэтай сферы дзейнасці. Гэта сфера абслугоўвання, сэрвісу, тут патрэбны пэўны склад псіхікі і характару. Сюды павінны ісці людзі, для якіх гэта прызванне. А паколькі тут зараз створаны вельмі льготныя ўмовы, то ёсць небяспека, што могуць прыйсці дзеля нажывы.

У аграгурызм павінны прыходзіць сапраўды патрыёты беларускай вёскі. У Год роднай зямлі недастаткова, каб вясковыя міні-гасцініцы прапаноўвалі толькі ложак і сняданак. Патрэбны дадатковыя паслугі, якія дапамогуць турыстам больш даведацца пра нашы традыцыі, рамёствы, фальклор, гісторыю, прыроду, лад жыцця, менталітэт. Патрэбны комплексны прадукт, заснаваны на нацыянальнай ідэі. Дык вось, я хачу, каб і якасць павысілася, і змест паглыбіўся. А статыстыка няхай будзе такой, якой яе стварае жыццё, і не трэба гнацца за лічбамі.

**— Якімі рысамі павінен валодаць гаспадар вясковай міні-гасцініцы?**

— Ён павінен мець здольнасць псіхалагічна добра пераносіць кампанію чужых людзей і атрымліваць задавальненне ад зносінаў з імі. Зносіны — гэта вельмі вялікія энергетычныя затраты. Пакуль не паспрабуеш, цяжка зразумець, што гэта такое, калі ў цябе на сядзібе 24 гадзіны ў суткі знаходзяцца чужыя людзі.

Другое. Такі гаспадар павінен любіць беларускую вёску і гэта павінен быць чалавек творчы. Тое, што адрознівае ўсіх «нашых» — неверагодная крэатыўнасць. Кожны гаспадар робіць сядзібу ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі, хобі і ладам жыцця. Але яму трэба ўмець яшчэ і распрацаваць праграмы знаходжання, якія ўлічваюць наш нестабільны клімат і неразвітую турыстычную інфраструктуру. Задача: не даць людзям засумаваць.

І нарэшце, вельмі важна, каб гаспадар сядзібы ўмеў наладжваць супрацоўніцтва. Не трэба думаць, што суседняя сядзіба — гэта канкурэнт. Наадварот, гэта ўзмацняе прадукт.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

## У СТУДЗЕНІ — «АДКАТ» ЗАРОБКАЎ

**Намінальная налічаная сярэдняя зарплата ў Беларусі ў студзені склала 919,6 тысячы рублёў — на 80,6 тысячы рублёў, ці на 8,1 адсотка менш, чым у снежні. Пра гэта паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Пры гэтым, адзначаюць у камітэце, рэальная (з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі) зарплата ў сёлетнім студзені ў параўнанні са студзенем мінулага года павялічылася на 5,5, а ў параўнанні з леташнім снежнем — зменшылася на 11,7 адсотка. У сёлетнім студзені сярэдняя зарплата на прамысловых прадпрыемствах склала 1 млн 40,1 тыс., у будаўнічых арганізацыях — 1 млн 160,8 тыс., на транспарце — 1 млн 49 тыс., у сельскай гаспадарцы — 583,1 тыс., гандлі і грамадскім харчаванні — 815,6 тыс., ахове здароўя — 700,8 тыс., адукацыі — 637,9 тысячы. Што да рэгіёнаў, то ў студзені лідарам па ўзроўні аплаты працы паранейшаму заставаўся Мінск — сярэдняя зарплата ў сталіцы адпавядала 1 млн 249,2 тыс. рублёў. Сярэдняя зарплата ў Брэсцкай вобласці была 788,8 тыс., Віцебскай — 801,7, Гомельскай — 855,5, Гродзенскай — 813,9, Мінскай — 926,5, Магілёўскай — 793,2 тыс. рублёў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## П'ЯНЫМ ВАДЗІЦЕЛЯМ — ДВА ГАДЫ НЯВОЛІ?

**ДАІ прапануе перадаць у яе кампетэнцыю разгляд спраў аб кіраванні аўтамабілем у нецвярозым стане першы раз на працягу года. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела навукова-метадычнага і прававога забеспячэння Упраўлення ДАІ МУС Беларусі Анатоль Сушко.**

Гэта прапанова звязана з іншай ініцыятывай МУС: аб тым, каб прыцягваць да крымінальнай адказнасці не толькі за паўторнае на працягу года кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнагаап'янення, але і за трэцяе такое парушэнне. «Цяпер жа складваецца такая сітуацыя, што за паўторнае кіраванне ў п'яным выглядзе наступае крымінальная адказнасць, а трэці раз — зноў адміністрацыйная», — растлумачыў Анатоль Сушко. За кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення другі і наступныя разы ДАІ прапануе ўвесці крымінальную адказнасць у выглядзе абмежавання свабоды тэрмінам да двух гадоў.

Асобную катэгорыю вадзіцельскіх правоў на кіраванне мапедам плануецца ўвесці ў Беларусі. Новая катэгорыя вадзіцельскіх правоў будзе называцца «АМ». Гэта катэгорыя будзе неабходна для кіравання транспартнымі сродкамі, аднесенымі да мапедаў, у тым ліку скутарамі.

З 29 сакавіка 2011 года ў Беларусі давядзецца ўводзіць новы ўзор вадзіцельскага пасведчання. З гэтай даты ўступаюць у дзеянне змяненні ў міжнародную канвенцыю аб дарожным руху і беларускае вадзіцельскае пасведчанне не будзе адпавядаць названай канвенцыі.

Плануецца таксама адмяніць адзіную катэгорыю «Е» для кіравання ўсімі катэгорыямі транспартных сродкаў з прычэпамі і ўвесці асобныя катэгорыі «ВЕ», «СЕ», «ДЕ». Акрамя таго, у новым узоры вадзіцельскага пасведчання будзе прысутнічаць подпіс яго ўладальніка.

ДАІ Беларусі прапануе змякчыць адказнасць вадзіцеляў за дробныя ДТЗ. У прыватнасці, вадзіцеляў, якія ўчынілі ДТЗ без пацярпелых і з невялікім матэрыяльным уронам, прапануецца караць толькі за парушэнне канкрэтнага пункта Правілаў дарожнага руху, а за ДТЗ, якое стала вынікам парушэння, прыцягваць да адказнасці толькі па патрабаванні пацярпелага боку. «Такім чынам, вадзіцеляў, якія ўчынілі дробныя ДТЗ, мы хочам вывесці з-пад жорсткіх санкцый».

**БЕЛТА.**

## ТРАГЕДЫЯ НА ДНЯПРЫ

**Два хлопчыкі патанулі, іх целы шукаюць вадалазы.**

Чатырохкласнікаў бачылі на Дняпры ў пасляабедзенны час 23 лютага, у раёне аднаго з гарадскіх аўтамабільных мастоў. Яны забаўляліся на лёдзе і праваліліся. Паводле сведкаў, адзін з хлопчыкаў патануў адразу, а другога праз хвіліну зацягнула пад лёд плынню. Відавочцы адразу патэлефанавалі ў службу выратавання і спрабавалі самі дапамагчы дзецям, аднак нічога не атрымалася. Целы школьнікаў праз суткі пасля трагічнага здарэння яшчэ не знайшлі.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЛАТВІЙЦАМ СПАДАБАЛАСЯ ПРАТЭСТАВАЦЬ

**Латвійскія сацыёлагі апублікавалі вынікі даследавання, паводле якіх большасць жыхароў краіны становіцца ставіцца да масавых акцый пратэсту, паведамляе Mixnews.**

Так, 69,4 адсотка жыхароў Латвіі падтрымліваюць правядзенне дэманстрацый, 65 адсоткаў — правядзенне страйкаў, 45,8 адсотка — блакіраванне вуліц і дарог, а 39,6 адсотка — распаўсюджванне лістовак і вулічную агітацыю. Акрамя таго, 22 адсоткі латвійцаў падтрымліваюць такія формы пратэсту, як захоп будынкаў Сойма і ўрада. Нагадаем, што ў сярэдзіне студзеня ў Рызе прайшлі масавыя антыўрадавыя акцыі, якія перараслі ў беспарадкі. Яны шмат у чым сталі прычынамі адстаўкі спачатку міністра сельскай гаспадаркі краіны, а затым і яе прэм'ер-міністра.

### ПАЛОВА РАСІЯН АСУДЗІЛА ЎРАД ЗА ДАПАМОГУ КРАІНАМ СНД

**Амаль палова жыхароў Расіі (49 адсоткаў) лічаць, што ўрад краіны падчас крызісу павінен выдаткоўваць сродкі на падтрымку ўласнай эканомікі, а не аказваць дапамогу іншым краінам. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі 14-15 лютага.**

Пры гэтым 47 адсоткаў рэспандэнтаў палічылі антыкрызісныя крэдыты, якія расійскі бок выдае дзяржавам-саюзнікам, «беззваротнымі марнаваннямі». Крыху менш, 40 адсоткаў апытаных, наадварот, заявілі, што гэтыя сродкі — інвестыцыя, якая ў будучыні прынясе Расіі нямала выгод.

### У РАСІІ АДАБРАЛІ 1,2 МІЛЬЁНА ВАДЗІЦЕЛЬСКІХ ПАСВЕДЧАННЯЎ ЗА ГОД

**За 2008 год адзін мільён 205 тысяч кіроўцаў былі пазбаўленыя пасведчанняў.**

У 365 тысяч 193 чалавек правы адабраныя па прычыне кіравання ў стане алкагольнага ап'янення, а яшчэ 25 тысяч чалавек пазбавілася правоў з-за наркатычнага ап'янення. Акрамя таго, яшчэ два мільёны 600 тысяч чалавек атрымалі папярэджанне, а 322 тысячы кіроўцаў арыштаваныя на 15 сутак.

## Пазітыўны крок

Прадаўжэнне Мінфінам ЗША рашэння аб прыпыненні эканамічных абмежаванняў адносна беларускіх прадпрыемстваў ААТ «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно» будзе пазітыўна ўспрынята дзелавымі коламі дзвюх краін. Такую думку выказаў прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў, каментуючы рашэнне Мінфіна ЗША захаваць у сіле да 1 чэрвеня 2009 года мараторый на эканамічныя санкцыі адносна гэтых двух прадпрыемстваў.

## Сяргей Літвінаў абвінавачвае пекінскую лабараторыю...

Трэнер кідальніка молата Івана Ціхана расійскі спецыяліст Сяргей Літвінаў назваў сваю версію дыскваліфікацыі беларускіх малатабойцаў пасля пекінскай Алімпіяды. Учора ён паведаміў, што з дазволу кіраўніка Нацыянальнай антыдопінгавай лабараторыі Мікалая Кручынскага можа назваць прычыну станоўчых допінг-пробаў. Гэта — падлог у пекінскай лабараторыі аналітычных матэрыялаў Ціхана і Дзевятоўскага. Да такой высновы прыйшлі спартсмены, трэнеры і спецыялісты, азнаёміўшыся з дакументамі з пекінскай лабараторыі.

Больш падрабязную інфармацыю, паводле слоў С. Літвінава, можна будзе атрымаць пасля падачы пашыранай апеляцыі ў Спартыўны арбітражны суд у Лазане. Тэрмін падачы дакументаў заканчваецца 27 лютага, аднак адвакаты спадзяюцца падоўжыць яго да 7 сакавіка.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Минский городской центр недвижимости

**УП «Минский городской центр недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже здания многофункционального, принадлежащего УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ» (металлический склад общей площадью 193,9 кв. м, инв. № 500/С-47118), расположенного по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 2.**

Начальная цена – 348 104 700 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 38 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **12 марта 2009 года** в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **10 марта 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.02.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 840,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 622,42 |
| 1 латвійскі лат | 5 119,88 |
| 1 літоўскі літ | 1 048,65 |
| 1 чэшская крона | 127,59 |
| 1 польскі злоты | 776,54 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 78,83 |
| 1 украінская грыўня | 317,32 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 36,0254 |
| 10 UAH | 40,2518 |
| 1000 BYR | 12,7029 |
| EUR | 45,9108 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ДАЎ ЗАДНІ ХОД

Каб праверыць святло задняга ходу, адзін з вадзіцеляў сеў за руль, а другі стаяў за машынай і калупаўся з той лямпачкай.

Машына дала задні ход і вадзіцель, які займаўся рамонтам, трапіў пад колы і загінуў на месцы. Баранавіцкая пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Сяргей Літвінаў абвінавачвае пекінскую лабараторыю...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сілы, якія будуць нам супрацьстаяць — непрадказальныя, і разгляд справы можа цягнуцца да чатырох месяцаў. З моманту пачатку барацьбы з допінгам у спорце такіх прэцэдэнтаў не было», — заявіў С. Літвінаў.

Таксама спецыяліст паведаміў, што разгляд справы абыдзецца прыкладна ў 300 тысяч долараў, расходы ўзялі на сябе трэнер і самі спартсмены. Расійская кампанія «Ітэра» гатова выдаткаваць 80 тысяч долараў (30 ужо выдаткавала), 50 тысяч долараў пералічыла брытанская кампанія «Хаманс», якая прадстаўляе інтарэсы спартсменаў. Па 3,5 тысячы атрымалі шэсць экспертаў, 35 тысяч долараў атрымаюць беларускія спецыялісты, 25 тысяч — адвакаты. Суддзя, якога абралі беларускія атлеты, пражывае ў Канадзе. Паводле слоў С. Літвінава, дзяржава і Мінспорту ў гэтым пытанні ніякай фінансавай падтрымкі не аказваюць. Больш за тое, трэнер паведаміў, што спыненыя з 15 снежня мінулага года выплаты спартсменам прэмій і стыпендый могуць адыграць сваю ролю ў гэтай справе. «Медалі пакуль застаюцца ў краіне, справа не прайграная, Спартыўны арбітражны суд у Лазане рашэння не прыняў. За намі цяпер назіраюць і санкцыі прыменены да спартсменаў якраз перад судом. І гэта, няма сумненняў, можа паўплываць на рашэнне суда».

Пасля прэс-канферэнцыі, дзе Сяргей Літвінаў спасылаўся на старшыню Нацыянальнай антыдопінгавай лабараторыі Мікалая Кручынскага, сам Кручынскі абверг інфармацыю пра тое, што ў пекінскай лабараторыі быў здзейснены падлог. У прыватнасці ён заявіў: «У нас няма падстаў меркаваць, што ў пекінскай лабараторыі адбыўся падлог мачы (аналітычных матэрыялаў). Я сапраўды нядаўна размаўляў з Сяргеем Літвінавым і нічога падобнага яму не заяўляў. Уся наша доказавая база грунтуецца на тым, што даследаванне пробаў у лабараторыі ажыццяўлялася не зусім акуратна, і у нас ёсць спадзяванні выйграць справу ў Лазане», — праінфармаваў Мікалай Кручынскі. Акрамя таго, ён паставіў пад сумненне станоўчы эфект ад прыцягнення ўвагі грамадскасці да справы малатабойцаў трэнерам Ціхана: «Літвінаву не трэба было рабіць такіх гучных абвінавачванняў у адрас пекінскай лабараторыі, каб не нашкодзіць справе і свайму падапечнаму».

Наконт свайго лёсу С. Літвінаў паведаміў наступнае: яго кантракт з Мінспорту заканчваецца 26 лютага, і паводле слоў трэнера, з міністэрствам спорту яны будуць імкнуцца знайсці кампраміс у далейшым супрацоўніцтве. У любым выпадку, пакідаць свайго вучня Літвінаў не мае намеру.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# Прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця пераглядацца не будзе...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адно пытанне, на якім грунтоўна спыніўся прэм'ер, — рост складскіх запасаў. Гэта, зазначыў ён, прыводзіць да значнага пагаршэння фінансавага стану прадпрыемстваў. Таму сёння неабходна рабіць усё магчымае, каб зніжаць затаварванне прадукцыяй. Паводле звестак Мікалая Зайчанкі, пасля некаторага зніжэння кошту запасаў у снежні мінулага года ў студзені іх рост узнавіўся, і на 1 лютага склаў каля 6 трыльёнаў рублёў, дасягнуўшы ўзроўню 84,6 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці супраць 61,1 працэнта на 1 студзеня. У гэтай сітуацыі далейшае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці павінна быць увязана з узроўнем складскіх запасаў. Міністр паведаміў, што Мінэканомікі распрацавала праект пастановы Савета Міністраў аб вызначэнні на гэты год нарматываў запасаў гатовай прадукцыі. Пры гэтым у дакументе прадугледжаны выхад па выніках года на нарматыў, вызначаны летась, — 57,5 працэнта да месячнага аб'ёму вытворчасці. «Мы даём міністэрствам і ўстановам магчымасць працаваць, гнутка рэагуючы на знешні попыт і не нарошчваць запасы ў дачыненні да тых, што сёння створаны на складах. Толькі такі падыход, — патлумачыў ён, — дазваляе забяспечыць захаванне рэальнага сектара эканомікі ва ўмовах фінансавага крызісу».

Дарэчы, падтрымаць попыт на прадукцыю айчынных вытворцаў можна і за кошт нарошчвання продажу тавараў у крэдыт. Праўда, як заўважыў Мікалай Зайчанка, гэтая схема сёння не можа шырока выкарыстоўвацца: скаліся высокія працэнты платы за крэдыт. Таму міністэрствам прапануецца выкарыстаць іншую схему продажу беларускіх тавараў — з растэрміноўкай плацяжу. Шэрагу міністэрстваў і канцэрнаў неабходна прапрацаваць пытанні ўдасканалення продажу айчынных тавараў насельніцтву з растэрміноўкай плацяжу без прыцягнення ў схемы разлікаў крэдытных рэсурсаў банкаў. І перш за ўсё гэта павінна быць рэалізавана праз фірменны гандаль.

Канстатаваўшы, што з-за ўплыву сусветнага фінансавага крызісу захоўваецца агульная тэндэнцыя замаруджвання эканамічнага росту, Мікалай Зайчанка праінфармаваў, што ў асобных сферах беларускай эканомікі, тым не менш, атрыманы нядрэнныя вынікі. У прыватнасці, за студзень выкананы прагноз па росце інвестыцый у асноўны капітал — яны павялічыліся на 24,9 працэнта. У адпаведнасці з прагнозам рэалізуецца жыллёвая праграма: за першы месяц года ўведзена ў эксплуатацыю 294,5 тысячы квадратных метраў жылля. У сельскай гаспадарцы тэмпы росту вытворчасці прадукцыі склалі 8,4 працэнта. Захоўваюцца высокія тэмпы росту і рознічнага тавараабароту — 112,3 працэнта. Апошняму, дарэчы, у пэўнай меры спрыяў павышаны попыт на тавары працяглага карыстання, асабліва на пачатку студзеня. Да прыкладу, у параўнанні з леташнім студзенем у сёлетнім продаж халадзільнікаў узрос у два з паловай разы, пральных машын — у паўтара, тэлевізараў — у 1,3.

На думку Мікалая Зайчанкі, нягледзячы на карэктывы, што ўнеслі сусветныя падзеі ў развіццё айчыннай эканомікі, пераглядаць прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на гэты год немэтазгодна. Гаворачы пра сусветны крызіс, ён падкрэсліў, што ніхто не мае дакладных рэцэптаў па яго глыбіні і працягласці. «Набірае вагу меркаванне заходніх экспертаў, што цяперашні сусветны фінансавы крызіс пяройдзе ў працяглую стагнацыю сусветнай эканомікі, — сказаў міністр. — У прынцыповым плане зацверджаны прагноз не перашкаджае канкрэтнай працы па развіцці эканомікі».

Прагназуючы найбліжэйшыя перспектывы, міністр паведаміў, што за першы квартал рост ВУП чакаецца на ўзроўні 2 працэнтаў, у студзені-лютым — 2,5. Аб'ём прамысловай вытворчасці вырасце за студзень—сакавік на 1 працэнт, сельгасвытворчасці — на 7,5. Мінэканомікі таксама прагназуе і зніжэнне інвестыцый у асноўны капітал па выніках першага квартала да 3 працэнтаў: студзеньскі паказчык прыросту ў 24,9 працэнта быў у асноўным абумоўлены нізкай базай аналагічнага леташняга месяца. Што датычыцца сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, то ў студзені яно прагназуецца адмоўным — на ўзроўні 30 мільёнаў долараў, у студзені-лютым — мінус 130 мільёнаў. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг у першым квартале ацэньваецца на ўзроўні 4,4-4,5 працэнта замест 13—18 працэнтаў у папярэднія гады. Мікалай Зайчанка патлумачыў, што зніжэнне гэтага паказчыка выклікана зніжэннем цэнаў, каб захаваць прысутнасць беларускага экспарту на знешніх рынках, якія звужаюцца.

Ацэньваючы сітуацыю ў эканоміцы ў першым квартале, Мікалай Зайчанка лічыць, што хоць яна застаецца і вострай, але не крытычнай. «Агульным для ўсіх органаў кіравання з'яўляецца неабходнасць выходзіць з жорсткіх абставінаў канкурэнцыі, дэфіцыту крэдытных рэсурсаў і неабходнасці захавання працоўных месцаў і сацыяльных пазіцый, — зазначыў напрыканцы свайго дакладу міністр. — Гэта мае на ўвазе засваенне цяжкай долі — жыць па сродках, а значыць адмовіцца ад усяго залішняга і другаснага, любой цаной падтрымаць унутраны і захаваць знешні попыт на нашу прадукцыю, забяспечыць яе цэнавую канкурэнтаздольнасць».

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## ПЕРАПЛЫЛІ РАКУ Ў ЛЮТЫМ

**23 лютага каля гадзіны ночы на беразе Дняпра паблізу вёскі Кастрыцы Магілёўскага раёна выратавальнікі знайшлі цела мужчыны без бачных прыкметаў гвалтоўнай смерці. Яшчэ адзін мужчына быў шпіталізаваны з абмаражэннем пальцаў ног.**

Высветлілася, што два браты — 50-гадовы вясковец і 34-гадовы жыхар Магілёва, абодва непрацуючыя, — моцна п'яныя вырашылі скараціць шлях да вёскі Кастрыцы і пераплылі халодную ў ільдзінах раку. У выніку старэйшы брат памёр, а малодшы апынуўся ў бальніцы.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Абзац

■ **Грамадзянін Польшчы, 1967 г.н., загінуў у ДТЗ у Дуброўенскім раёне. Ён кіраваў грузавым аўтамабілем «Вольва» і ўрэзаўся ў фуру «Сканія», што стаяла ў спадарожным напрамку. Вядзецца разбор.**

■ Каля ста прадпрымальнікаў у Данецку правялі акцыю пратэсту супраць палітыкі Нацыянальнага банка Украіны. Яны прыйшлі да будынка банка з плакатамі і лозунгамі кшталту «Крэдытамор-2009». Прадпрымальнікі патрабуюць зніжэння працэнтнай стаўкі па крэдытах. Яны прынеслі на прыступкі абласнога ўпраўлення Нацбанка плакат з выявай грыўні і ўсклалі да яго жалобны вянок. З прадстаўнікамі банка ўдзельнікі акцыі так і не сустрэліся.

## Поўны абзац

■ **На працягу тыдня не працуе бібліятэка ў амерыканскім горадзе Аленсвіль. Прычына — скунс, які пасяліўся ў будынку. Жывёліну дагэтуль ніхто не можа знайсці. А зайсці ў бібліятэку немагчыма з-за вельмі моцнага непрыемнага паху, што выпрацоўваецца залозамі гэтай жывёліны. Усе спробы зладзіць скунса заканчваюцца беспаспяхова, нягледзячы на тое, што ў будынку працуе прафесійны капканшчык. Супрацоўнікі бібліятэкі лічаць, што сітуацыя склалася наколькі кур'ёзная, настолькі і сур'ёзная: многія кліенты ўстановы — школьнікі і пажылыя людзі, якія не могуць паехаць у іншы горад і скарыстацца паслугамі тамтэйшага кнігасховішча.**

■ 71-гадовая румынка звязала сабе адзенне з уласных валасоў. Яна адрошчвала валасы з 16 гадоў. Калі валасы дасягалі даўжыні ў метр, яна стрыгла іх і выкарыстоўвала для вырабу адзення. За жыццё жанчыне ўдалося вырабіць 9 прадметаў: капялюшык, шаль, спадніцу, блузку, плашч, кашалёк, сумачку і пару пальчатак. Апошнія рэчы сталі крыху святлейшымі, чым папярэднія: жанчына пачала сівець. Яна спадзяецца трапіць у Кнігу рэкордаў Гінэса.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

## ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина», (балансодержатель — УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина». В состав лота входит следующее имущество:

| № п/п | Наименование объектов | Инв. № |
|---|---|---|
| 1. | Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м) | 630/С-47603 |
| 2 | Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м) | 630/С-47604 |
| 3 | Детсад-ясли корпус № 1 (общая площадь – 1276,0 кв. м) | 630/С-47605 |
| 4 | Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв. м) | 630/С-47607 |
| 5 | Административно-приемный корпус (общая площадь – 101,1 кв. м) | 630/С-47608 |
| 6 | Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв. м) | 630/С-47609 |
| 7 | Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв. м) | 630/С-49350 |
| 8 | Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв. м) | 630/С-49353 |
| 9 | Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв. м) | 630/С-49354 |
| 10 | Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв. м) | 630/С-47570 |
| 11 | Склад (общая площадь – 165,1 кв. м) | |
| 12 | Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 км. м) | |
| 13 | Кабельная линия | |
| 14 | Внешние кабельные сети | |
| 15 | Наружное освещение | |
| 16 | Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п. | |
| 17 | Наружная канализация | |
| 18 | Водопровод с артскважиной | |
| 19 | Водонапорная башня | |
| 20 | Устройство подъездной автодороги | |
| 21 | Ограждение с воротами | |
| 22 | Противопожарный подъезд к водоему | |
| 23 | Котел Минск-1 | |
| 24 | Котел Минск-1 | |
| 25 | Теплообменник Р-025-8,9-1Х | |
| 26 | Лифт грузовой малый | |
| 27 | Лифт грузовой г/п 100 кг | |
| 28 | Таль электрическая МЗ-320 | |

Начальная цена – 2 133 716 497 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га, кадастровый номер 623881300098000008, земельный участок площадью 0,0232 га, кадастровый номер 62388130098000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300098000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **12 марта 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **10 марта 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.**



## НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ ОАО «БЭМЗ»

извещает акционеров о проведении 27 марта 2009 года в 13 часов очередного общего собрания акционеров по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, клуб ОАО «БЭМЗ».

**Повестка дня:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2009 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2008 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2009 год.
7. Об утверждении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 12 часов. Акционерам при себе иметь удостоверение личности, представителям — доверенность. Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 марта 2009 года.

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 19 марта 2009 года, в отделе кадров ОАО «БЭМЗ», 27 марта — по месту проведения собрания.

**Справки по телефонам: 8 0162 42 16 83, 42 13 65.**

УНП 200032892. Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ».



## Уважаемые акционеры ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин

ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин извещает акционеров о проведении 26 марта 2009 года в 14.00 очередного общего собрания акционеров по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

**ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ:**

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2009 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2008 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2009 год.
7. Об утверждении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер — паспорт; представитель — паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. № 1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 20 февраля 2009 года.

УНП 200093330 Наблюдательный совет ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин



## ОБЪЯВЛЕНИЕ

27 марта 2009 г. состоится очередное отчетно-выборное собрание акционеров ОАО «Камволь».

*Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.*

**Повестка дня**

1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2009 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2008 году.
3. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
4. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2008 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2009 год.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размеров вознаграждений членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».
9. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 17 02, 3 15.

**Начало работы собрания 14.00.**
**Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 26 февраля 2009 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393



## ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**ОАО «Испытания и сертификация бытовой и промышленной продукции «БЕЛЛИС»,**

***г. Минск, ул. Красная, 7***

1. Дата собрания: 27.03.2009
2. Время собрания: 14.00
3. Место проведения: ОАО «БЕЛЛИС», ул. Красная, 8
4. Время регистрации: с 13.00 до 13.45 (при себе иметь паспорт)
5. Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: пятница, начиная с 23.03.2009 по адресу: ул. Красная, 8, с 14.00 до 16.00, комната № 1.

**Повестка дня:**

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2009 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2008 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли и расходов на потребление на 2009 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав Общества.
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

УНП 100083399 **Председатель Наблюдательного совета И.А. Зданчук**



## Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд № 88»

**27 марта 2009 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Мостоотряд № 88»**

*Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 г. и об основных направлениях деятельности Общества в 2009 г.
2. О работе Наблюдательного совета в 2008 г. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. Утверждение заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 г., заключение Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2008 г.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2008 г.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2008 г. О выплате дивидендов за 2008 г.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2009 г. Периодичность выплаты дивидендов за 2009 г.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав Общества и об утверждении новой редакции Устава.
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи футбольному клубу «Дорожник».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 20 по 26 марта 2009 г. с 13 до 17 часов у председателя Наблюдательного совета, а в день собрания — в помещении, где оно будет проводиться — в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с 14.20 до 14.55 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 27 марта 2009 года в 15.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 5 марта 2009 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:** акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100299744 **Наблюдательный совет.**



## Уважаемые акционеры ОАО «Институт «Минскгражданпроект»

26 марта 2009 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Институт «Минскгражданпроект», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20а.

*Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Гебелева, 5, актовый зал профессионально-технического колледжа им. В.Г. Каменского.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

**1. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2008 году.**
*Докладчик — председатель Наблюдательного совета Общества.*
**2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году и основных направлениях деятельности Общества на 2009 год.**
*Докладчик — директор Общества.*
**3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.**
*Докладчик — председатель Ревизионной комиссии Общества.*
**4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.**
*Докладчик — главный бухгалтер Общества.*
**5. О распределении прибыли и выплате дивидендов за 2008 год.**
*Докладчик — главный бухгалтер Общества.*
**6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2009 год и I квартал 2010 года.**
*Докладчик — главный экономист Общества.*
**7. О предоставлении органам управления Обществом права принятия решений по отдельным вопросам, отнесенным к компетенции собрания.**
*Докладчик — председатель Наблюдательного совета Общества.*
**8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.**

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20а с 16 по 26 марта 2009 года (с 9.00 до 17.00) либо 26 марта по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания с 14.30 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 26 марта 2009 года в 15.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 20 марта 2009 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и зарегистрированную доверенность.**

УНП 600013280 Наблюдательный совет ОАО «Институт «Минскгражданпроект».



## ОАО «МОЛОДЕЧНОЛЕС»

сообщает, что 27.03.2009 года в 11.00 по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106, состоится общее годовое собрание акционеров ОАО «Молодечнолес».

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году и определение основных направлений деятельности Общества в 2009 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
4. Распределение прибыли (покрытие убытков) Общества за 2008 год. О выплате дивидендов за 2008 год.
5. О направлениях использования прибыли Общества в 2009 году и в I квартале 2010 года.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. О вознаграждении членов Наблюдательного совета ОАО «Молодечнолес» и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
8. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 с 19 по 26 марта (с 9.00 до 16.30) либо 27 марта с 9.30 до 10.00.

**Начало работы собрания — 27 марта 2009 года в 11.00.**

Регистрация участников с 9.00 до 10.30 по предъявлению документа, подтверждающего личность, а представителю акционера и доверенность.

Список акционеров Общества по данным реестра акционеров на 1 марта 2009 года.

**Тел. для справок 8 (01771) 3 52 32.**

УНП 600066488 Наблюдательный совет ОАО «Молодечнолес».



## ОТЧЕТ

**Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение-Агро» об использовании своего имущества за 2008 год**

Количество учредителей Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение-Агро» — 10, из них 10 — физические лица.

**Информация о стоимости имущества Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение-Агро» (далее — Фонд):**

- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет — 3 500 000 белорусских рублей;
- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с Уставом Фонда, составляют — 163 153 866 белорусских рублей;
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, — 6 189 240 белорусских рублей;
- доходов от предпринимательской деятельности, осуществляемой Фондом, — нет.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составила — 108 210 513 белорусских рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790386638



## Уважаемые акционеры ОАО «Знамя индустриализации»

30 марта 2009 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Знамя индустриализации» по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, зал заседаний.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году и основных направлениях деятельности Общества на 2009 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2008 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. О результатах проверки Службой ведомственного контроля концерна «Беллегпром» и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2008 год. О выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2009 год и I квартал 2010 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. О субсидии на безвозвратной основе из инновационного фонда концерна «Беллегпром» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 августа 2006 г. № 528 «О некоторых мерах по стабилизации финансового положения отдельных организаций».
10. Об увеличении уставного фонда Общества путем выпуска дополнительных акций на сумму субсидии, предоставленной из инновационного фонда концерна «Беллегпром».
11. Об утверждении решения о выпуске дополнительных акций.
12. Об утверждении изменений в Устав Общества и утверждение Устава Общества в новой редакции.

**С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу**: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, в рабочие дни с 19 по 29 марта 2009 года по месту нахождения Общества (комн. 34), с 9.00 до 16.00, 30 марта 2009 года по месту проведения собрания.

**Регистрация участников собрания** с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания** — 30 марта 2009 года в 14.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 01 марта 2009 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

- акционеру Общества — паспорт;
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300200360. Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации».

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 лютага 2009 г. № 7 (159)


ТЭМА ДНЯ

## АДЭКВАТНЫЯ ЗАКОНЫ ГРУНТУЮЦЦА НА РЭАЛІЯХ

**На чарговы семінар Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёна сабраліся сенатары Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Яны абмяркоўвалі актуальныя пытанні дзейнасці верхняй палаты парламента.**

Паводле слоў **кіраўніка семінара, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Антаніны МОРАВАЙ**, асноўнай задачай семінара стала вызначэнне прыярытэтных кірункаў дзейнасці членаў Савета Рэспублікі на сучасным этапе развіцця краіны. У сваім выступленні Антаніна Морава звярнула ўвагу парламентарыяў на тое, што ў цяперашняй сацыяльна-эканамічнай сітуацыі неабходна рэгулярна бываць у працоўных калектывах, уважліва ставіцца да разгляду зваротаў грамадзян, узаемадзейнічаць з органамі выканаўчай улады на месцах і мясцовымі Саветамі дэпутатаў. Усе гэтыя формы работы, на яе думку, стануць не толькі своеасаблівым маніторынгам правапрымяняльнай практыкі, але і дазволяць атрымліваць інфармацыю аб тым, як працуе той ці іншы закон, ці мае ён патрэбу ў змяненнях і дапаўненнях.

— На фоне глабальнага эканамічнага крызісу, — заўважыла выступоўца, — сітуацыя ў сваёй краіне патрабуе ўважлівага стаўлення з боку ўсіх органаў улады. Парламент павінен адказваць на выклікі часу адэкватнымі законамі. Антаніна Пятроўна прыводзіла шмат прыкладаў, калі своечасовыя заканадаўчыя акты папярэдзілі многія негатыўныя з'явы. Так, Дэкрэт Прэзідэнта № 22 аб забеспячэнні гарантый укладаў у беларускіх банках, які быў ухвалены Саветам Рэспублікі, па-сутнасці, прыпыніў адток укладаў грамадзян. У кожным рэгіёне можна ўпэўніцца, як спрацоўвае заяўляльны прынцып рэгістрацыі сваёй справы. Рыхтуецца цэлы блок законаў сацыяльнай накіраванасці, сярод якіх вылучаецца сваёй надзённасцю закон аб моладзевай дзяржаўнай палітыцы. На сустрэчах з людзьмі, у сваёй паўсядзённай рабоце сенатары павінны не толькі вывяраць, як працуюць прынятыя ўжо законы, але і рыхтаваць асабістую інтэлектуальную глебу для аналізу законаў будучых.

Пра гэта і гаварылі калегі з дзвюх абласцей. І напачатку па-слухалі практыка — аднаго з кіраўнікоў абласной выканаўчай улады. **Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанід ЦУПРЫК** коратка пазнаёміў удзельнікаў семінара з сацыяльна-эканамічнай карцінай развіцця вобласці. Леаніду Аляксандравічу задавалі шмат пытанняў: аб формах зваротнай сувязі з грамадзянамі, якая практыкуецца ў выканкаме, аб перспектывах развіцця турызму, аб ходзе выканання 18-га Дэкрэта.

Адказваючы на першае пытанне, Леанід Цупрык заўважыў, што работа са зваротамі грамадзян мае разнастайныя формы і носіць сістэмны характар. Напрыклад, толькі летась за хібы ў гэтай рабоце 164 службовыя асобы атрымалі дысцыплінарныя спагнанні. Акрамя традыцыйных асабістых прыёмаў, якія праводзяць старшыня аблвыканкама і яго намеснікі, у пастаянную практыку ўваходзяць «прамыя тэлефонныя лініі», тэлемасты з рэгіёнамі. Нядаўна прайшоў такі тэлемост з жыхарамі Лунінецкага і Столінскага раёнаў, які правёў Леанід Цупрык. Зараз рыхтуецца прамая лінія першага намесніка старшыні аблвыканкама з прадпрымальнікамі. Такія зносіны даюць вельмі многа інфармацыі для роздуму, дазваляюць лепш валодаць сітуацыяй у рэгіёнах. Калі ў чалавека з'явілася больш магчымасцяў дастукацца да ўлады і атрымаць адказ на сваё пытанне, то і вынікі відавочныя. У цэлым па вобласці за апошні год паток скаргаў і зваротаў знізіўся на 10 працэнтаў.

Праблемы ў галіне развіцця турызму на Брэстчыне такія ж, як у іншых рэгіёнах. На думку выступоўцы, трэба спрыяць стварэнню новых аграсядзібаў. Іх у рэгіёне 75, і ўсе яны запатрабаваныя. А вось з прыдарожным сэрвісам справы далёка не на належным узроўні. Адна з асноўных прычын таго, што дзелавыя людзі не праяўляюць ахвоты да ўзвядзення аб'ектаў сэрвісу — дарога Е-30, так званая «алімпійка», не перасякае ніводзін населены пункт.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# АПТЫМІЗАВАЦЬ, НЕ ПАШЫРАЮЧЫ ШТАТ?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Сёння «штатнае пытанне» з'яўляецца асабліва балючым для сельсаветаў з вялікай колькасцю жыхароў**

**Бараўлянскі сельсавет і яго цэнтр — пасёлак Лясны — практычна прыгарад сталіцы. Адсюль да горада можна даехаць за паўгадзіны на маршрутным ці рэйсавым аўтобусах, якія курсіруюць без перапынку. Штодзень грамадскім транспартам карыстаюцца сотні людзей, якія працуюць у сталіцы, а жывуць у Бараўлянскім сельсавеце. Або наадварот… Многія мінчане набылі тут кватэры, дамы і катэджы. Так што назва «сельсавет» у некаторай ступені ўмоўная — па сваім менталітэце і ўзроўні патрабаванняў большасць мясцовых жыхароў даўно не адрозніваецца ад сталічных.**

Па колькасці насельніцтва — больш за 25 тысяч чалавек — Бараўлянскі сельсавет даганяе не толькі многія райцэнтры, а нават некаторыя раёны. Развіццё мясцовай інфраструктуры ўжо не паспявае за міграцыйнымі працэсамі і натуральным прыростам насельніцтва. У гімназіі, разлічанай на 400 вучняў, сёння займаецца 700. У школе, якую павінны наведваць 700 чалавек, вучыцца 1,5 тысячы. На чаргу ў дзіцячы садок неабходна станавіцца ледзь ці не адразу ж пасля нараджэння дзіцяці…

Але людзі хочуць будавацца і жыць менавіта тут, таму сёння Бараўлянскі сельсавет нагадвае вялікую будпляцоўку. Колькасць тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пастаянна павялічваецца і падбіраецца да 5 тысяч. Людзі, якія прыязджаюць сюды працаваць з іншых населеных пунктаў, рэгіструюцца і таксама становяцца ў чаргу на атрыманне кватэры. Сёння пры сельвыканкаме ўжо створаныя два жыллёва-будаўнічыя кааператывы. Старшыня Бараўлянскага сельскага Савета Аляксандр Савончык не загадвае наперад. «Калі працэс будаўніцтва пойдзе нармальна і завершыцца ў неабходны тэрмін, то «кватэрная» чарга зменшыцца на 1,5 тысячы чалавек», — кажа ён.

На думку кіраўніка мясцовага органа ўлады, штатны расклад самога сельвыканкама даўно не адпавядае патрабаванням гэтай тэрытарыяльнай адзінкі. На сёння 11 з «паловай» супрацоўнікаў ледзь спраўляюцца з наплывам наведвальнікаў. Спецыфіка іх працы ў тым, што гэта не толькі «стацыянарны» прыём грамадзян, але і выезды «на месца» — па тых жа зямельных пытаннях або па праблемах, якія знаходзяцца пад наглядам архітэктара (увод дамоў у эксплуатацыю, кансервацыя будоўлі, рэканструкцыя, дазвол на будаўніцтва і г.д.).

Напрыклад, у мінулым годзе ў сельвыканкаме было зарэгістравана 689 зваротаў грамадзян па зямельных пытаннях і 736 — па архітэктурных.

— Між тым, землеўпарадчык у нас адзін, а спецыяліст, які займаецца пытаннямі архітэктуры і будаўніцтва, увогуле працуе на 0,5 стаўкі, — тлумачыць Аляксандр Савончык.

Дадатковы работнік неабходны і ў кабінет, дзе адбываецца рэгістрацыя па месцы жыхарства і па месцы знаходжання, а таксама вырашаюцца жыллёвыя пытанні. Праз кабінет у прыёмны дзень праходзіць ад 60 да 100 чалавек. Двум спецыялістам, кожны з якіх адказвае за свой участак работы, не заўсёды ўдаецца ўкласціся ў вызначаныя часавыя рамкі. Падчас аўральных сітуацый (а такія не рэдкасць) даводзіцца выручаць адно аднаго.

Яшчэ сельвыканкаму неабходны юрыст, справавод, загадчык па гаспадарцы… Гэта — мінімум. Вядома, што «напружанне» са штатным раскладам перыядычна ці пастаянна зведвае большасць нізавых уладных структур. Сёння «штатнае пытанне» з'яўляецца асабліва балючым для сельсаветаў з вялікай колькасцю насельніцтва і развітай вытворчай базай.

Аднак у Бараўлянскім сельвыканкаме паспрабавалі мінімізаваць праблему з недахопам кадраў, падышоўшы да яе вырашэння з іншага боку. Калі нельга пашырыць штат, значыць, неабходна аптымізаваць работу наяўных спецыялістаў. Гэта значыць, стварыць такія ўмовы працы, якія пазбавілі б супрацоўнікаў ад лішняй мітусні: кожны з іх выконваў бы толькі свае функцыі, не дублюючы дзеянні іншых.

Каб дамагчыся такога выніку, спатрэбіліся пэўнае тэхнічнае пераўзбраенне (лакальная камп'ютарная сетка) і кадравыя перастаноўкі.

— Я прыйшоў на гэту пасаду год таму, практычна на ўсё гатовае, — усміхаецца Аляксандр Савончык. — Лакальная сетка з праграмай «Сельскі Савет» была ўсталяваная. Але мы пастаянна, літаральна штодзень яе ўдасканальвалі і ўдасканальваем, працуючы ў шчыльным кантакце з брэсцкімі праграмістамі-распрацоўшчыкамі.

Уся работа сельвыканкама размеркавана паміж спецыялістамі, кожны адказвае непасрэдна за свой «профіль» і ў адпаведнасці з гэтым профілем уносіць дапаўненні ў сельсавецкую базу звестак. А ў выніку фарміруецца агульная «карціна». Напрыклад, пры ўводзе таго ці іншага дома ў эксплуатацыю спачатку ў камп'ютарную праграму ўносіць звесткі архітэктар — ён пазначае імя ўласніка і тэхнічныя характарыстыкі дома. На ўлік домаўладанне ставіць сакратар (у той жа праграме)… А рэгіструюць чалавека ў «пашпартным стале». Чым больш звестак аб усіх зменах грамадзянскага і маёмаснага становішча жыхароў сельсавета ўнесена ў праграму, тым прасцей пры неабходнасці адшукаць патрэбную інфармацыю і выдаць чалавеку неабходную даведку.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**



**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

**Рабочы момант. Старшыня Бараўлянскага сельскага Савета Аляксандр САВОНЧЫК *(у цэнтры)*, галоўны бухгалтар Таццяна ПАБЯГАЙКА і намеснік старшыні Вадзім ШУМСКІ.**

# ДАКУМЕНТАЎ ХАПАЕ. ЗАСТАЛОСЯ ПРЫМЯНІЦЬ ІХ НА ПРАКТЫЦЫ

**Ці стануць цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва сувязным звяном паміж органамі ўлады і самім прадпрымальнікам?**

**В а ўмовах фінансавай нестабільнасці і падзення аб'ёмаў вытворчасці буйных прадпрыемстваў наша дзяржава робіць стаўку на развіццё малога і сярэдняга бізнэсу (мабільнасць і аператыўнасць рэагавання на змены попыту робяць прыватныя прадпрыемствы больш жыццястойкімі). Для палягчэння ўмоў гаспадарання кіраўніцтва краіны прыняло шэраг заканадаўчых дакументаў, аднак ці ўсе яны дасягнулі сваёй мэты? Ці засталіся яшчэ праблемныя пытанні, якія тармозяць развіццё прыватнага бізнэсу, асабліва на перыферыі? Пра гэта і не толькі наша размова з дырэктарам ТАА «Барысаўскі цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва» Уладзімірам ІСАЕВЫМ.**

**— Уладзімір Іванавіч, раскажыце, калі ласка, чым займаецца ваш цэнтр?**

— У сваёй дзейнасці мы кіруемся пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 чэрвеня 2008 года № 825 «Аб цэнтрах падтрымкі прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» і Палажэннем аб цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Там распісаны ўсе нашы функцыянальныя абавязкі. Як цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва, мы аказваем кансультацыі па пытаннях арганізацыі і вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці, падаткаабкладання і бухгалтарскага ўліку, складаем бізнэс-планы для атрымання прадпрымальнікамі крэдытаў пад стварэнне свайго бізнэсу, аказваем паслугі па вядзенні персаніфікаванага ўліку, праводзім маркетынгавыя даследаванні, займаемся падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай кадраў. Сёння без пэўных ведаў прыбыткова працаваць у сферы бізнэсу даволі складана, а многія прадпрымальнікі не маюць профільнай адукацыі і прыходзяць да нас з такімі пытаннямі, якія чалавеку, хоць бы крыху знаёмаму з эканомікай, падаліся б смешнымі… Мы яшчэ з'яўляемся базавым цэнтрам падтрымкі прадпрымальніцтва ў вобласці. І ў гэтым сэнсе наша асноўная задача — каардынацыя дзейнасці падобных цэнтраў і бізнэс-інкубатара малога прадпрымальніцтва ў Калодзішчах.

**Сёння ў камісіях і структурах, якія разглядаюць пытанні развіцця прадпрымальніцтва ў рэгіёне, практычна няма прадпрымальнікаў.**

**— Некаторыя цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва, выходзячы з мясцовых умоў, большы націск робяць на нейкі адзін накірунак бізнэсу, як, напрыклад, «Цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва «Камарова» (што ў Мядзельскім раёне). Ці мае ваш рэгіён (і цэнтр адпаведна) сваю вытворчую спецыфіку?**

— Мы аказваем паслугі ўсім прадпрымальнікам Барысаўскага раёна: і фермерам, і прамысловым вытворцам, і перавозчыкам, і гандлярам. Канкрэтнай спецыфікі я не назваў бы. Як і ва ўсім цывілізаваным свеце, прадпрымальніцтва ў нас развіваецца ў тых кірунках, якія найбольш выгадныя для прадпрымальніка. Адзін час асабліва выгадным быў продаж мабільных тэлефонаў — усе кінуліся туды. Была выгадная дрэваапрацоўка — займаліся ёю. Цяпер выгадна вырабляць шклопакеты і дзверы — асвойваюць гэтую вытворчасць. Вось калі б прадпрымальнікі былі «звязаны» нейкімі мясцовымі сыравіннымі рэсурсамі (напрыклад, каштоўнымі металамі), можна было б гаварыць пра вытворчую спецыфіку рэгіёна. А так, прыватны бізнэс развіваецца ў залежнасці ад патрэб насельніцтва, ад спажывецкага попыту. Іншая справа, што ў розных рэгіёнах існуе розная колькасць суб'ектаў гаспадарання, і для таго, каб не стварацца сабе жорсткай канкурэнцыі, прадпрымальнікі пачынаюць развіваць менш асвоеныя нішы. У Барысаўскім раёне сёння запатрабаванымі з'яўляюцца вытворчасць і ўстаноўка вокнаў і дзвярэй, паслугі па ўцяпленні дамоў, грузавыя і пасажырскія аўтаперавозкі. Актыўна развіваецца сфера паслуг (цырульні, пральні, абутковыя майстэрні), аднак асноўная доля па-ранейшаму прыходзіцца на рознічны гандаль.

Перад тым як пачаць сваю справу, кожны загадзя павінен пралічыць яе мэтазгоднасць. Чаму сёння бізнэс з Мінску адыходзіць на перыферыю (у Мінскі, Барысаўскі раён)? Бо там ніжэйшая, у параўнанні са сталіцай, арэндная плата, а для вытворчасці, якая заўсёды прадугледжвае значныя арэндныя плошчы, гэта сур'ёзная эканомія. Скарачэнне затрат абумоўлівае зніжэнне сабекошту і цаны, што павышае канкурэнтаздольнасць прадукцыі.

**— Апошнім часам у нашай дзяржаве быў прыняты шэраг заканадаўчых дакументаў, закліканых спрасціць умовы вядзення бізнэсу. Як вы ацэньваеце іх эфектыўнасць?**

— Дакументы ў нас прымаюцца выдатныя, аднак не ўсе яны рэалізуюцца на практыцы. Прывяду прыклад. Сёння даволі шмат пустых памяшканняў — безгаспадарчых, нікому не патрэбных. Ёсць дакументы, якія прадугледжваюць іх продаж прадпрымальнікам за адну базавую велічыню, перадачу на бязвыплатнай аснове. Аднак на практыцы такога няма. Загад прыняты, а мясцовыя ўлады не даюць яму развіцця. Атрымліваецца, што гэтыя безгаспадарчыя аб'екты, дзе прадпрымальнікі маглі б развіваць свой бізнэс, проста развальваюцца, у лепшым выпадку зносяцца, але прадпрымальнікам не перадаюцца. Гэта, безумоўна, недзяржаўны падыход, аднак пэўная логіка тут ёсць. Прыняць рашэнне аб перадачы нейкага аб'екта суб'екту прадпрымальніцкай дзейнасці, — азначае ўзяць на сябе адказнасць. А які чыноўнік захоча браць на сябе адказнасць? Разваліўся будынак — і добра. За гэта чыноўніка з пасады не знімуць.

У заканадаўчых дакументах, якія павінны стымуляваць развіццё прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці, прадугледжаны льготы па падаткаабкладанні, перадача аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці… У тым ліку і аказанне фінансавай падтрымкі (крэдытаў) у межах 20 тысяч долараў (без гарантый) на стварэнне працоўных месцаў у сельскай мясцовасці. Аднак сёння гэтая норма не працуе. Ёсць адпаведнае рашэнне нацыянальнага банка, аднак няма канкрэтных палажэнняў аб выдачы гэтых грошай (банкі іх не распрацоўваюць, бо ім нявыгадна без усялякіх гарантый выдзяляць такую значную суму, тым больш, што ў сённяшніх складаных умовах банкі ўвогуле грашыма не раскідваюцца).

Сёння шмат гаворыцца пра тое, што прадпрымальнік не дапускаецца да крэдытных рэсурсаў дзяржавы. Справа ў тым, што бедны прадпрымальнік, якому патрэбны крэдытныя грошы, не можа іх узяць, бо ў яго няма ні закладу, ні паручыцельства перад банкам. А багатаму крэдытныя грошы проста не патрэбныя. Вось уся сістэма і «завісае». На Захадзе створаны гарантыйныя фонды, якія выступаюць гарантам перад банкам за атрыманыя малым прадпрыемствам крэдытныя рэсурсы. Гэта страхоўка для банка. І да таго часу, пакуль не будуць створаны такія гарантыйныя фонды ў Беларусі, увогуле цяжка весці гаворку пра атрыманне крэдытных рэсурсаў на пачатковым этапе прадпрымальніцкай дзейнасці.

**— Дзе ж сёння можа ўзяць грошы прадпрымальнік-пачатковец?**

— Толькі ў фондзе занятасці насельніцтва — пад стварэнне новых працоўных месцаў. Днямі да мяне прыходзіла жанчына, якая стварае тры працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці (арганізуе рознічны гандаль). Пад гэта фонд занятасці выдзеліў ёй безадсоткавую пазыку на 18 месяцаў у памеры 40 млн рублёў (стварэнне аднаго працоўнага месца ацэньваецца ў 13 млн). Гэта добрыя грошы, і практычна бясплатныя.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ

**На чарговай сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў заслухалі справаздачы, вызначылі задачы на будучыню і ўзнагародзілі лепшых.**

Галоўнае пытанне сесіі — абмеркаванне і зацвярджэнне справаздачаў за мінулы год. Праўда, з пункту гледжання цяперашніх рэаліяў 2008 год выглядае калі не цалкам паспяховым, дык вельмі дабрабытным. Негатыўныя наступствы сусветнага эканамічнага крызісу беларуская эканоміка адчула толькі напрыканцы года. Затое год 2009, паводле аднаго з выступоўцаў на сесіі, будзе іспытам на трываласць для ўсёй краіны.

Таму натуральна, што сёння людзей найбольш хвалюе, як перажыць крызіс, як справіцца з яго ўплывам, як прайсці гэта выпрабаванне з найменшымі стратамі. Аднак дэпутаты і прадстаўнікі ўлады на сесіі больш казалі пра год мінулы, чым пра праблемы цяперашнія.

На фоне падрыхтаваных выступленняў — часта з просьбамі аб выдаткаванні сродкаў на патрэбныя рэчы і праекты — найбольш вылучалася прамова **старасты вёскі Гайшын Слаўгарадскага раёна Марыі ІГНАЦЕНКІ**. У гэтай вёсцы, пацярпелай ад Чарнобыльскай аварыі і потым рэабілітаванай, даўно зразумелі адну простую рэч: кожны павінен паклапаціцца пра сябе сам. Некалькі гайшынскіх сем'яў аб'ядналі свае намаганні і пры дапамозе дабрачыннай праграмы па рэабілітацыі постчарнобыльскіх тэрыторый сталі вырабляць у сваіх гаспадарках чыстую прадукцыю: спачатку вырошчвалі бульбу і гародніну, а цяпер гадуюць і жывёлу. Сама Марыя Ігнаценка па сельскагаспадарчы вопыт з'ездзіла пад Парыж, прывезла адтуль расаду клубніцаў і цяпер вырошчвае французскія ягады.

Да руху самадапамогі цяпер далучаюцца і новыя сем'і. Пасля працы жанчыны арганізуюць вясковыя святы, выходзяць на суботнікі па добраўпарадкаванні вёскі і хочуць аднавіць праваслаўную царкву. І нездарма лідар Гайшына Марыя Ігнаценка прызнана ў абласным спаборніцтве органаў самакіравання лепшай старастай у Магілёўскай вобласці.

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК** выступіў перад дэпутатамі на тэму падзей цяперашніх. Ён нагадаў, што трэба выконваць прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Узровень вытворчасці павінен павялічыцца на 13,5% у параўнанні з 2008 годам, але ў першы месяц гэтага года ён яшчэ і знізіўся. Таму Пётр Руднік паставіў задачы: не зніжаць аб'ёмы вытворчасці, скарачаць складскія запасы і гандляваць, утрымліваць старыя і заваёўваць новыя рынкі. Ён таксама настойваў на эканоміі выдаткаў і запатрабаваў скарачыць урачыстасці, узаемныя віншаванні і набыццё падарункаў, а таксама паклапаціцца аб вяртанні бюджэтных пазык.

— Дэпутацкі корпус павінен зладжана працаваць разам з выканаўчай уладай, — сказаў Пётр Руднік. — У дзвюх галін улады агульная задача: павелічэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей.

Да плённай працы заклікаў усіх і **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Барыс БАТУРА**, які прысутнічаў на сесіі. Ён прасіў мясцовых кіраўнікоў не расслабляцца і не спасылацца на крызіс. На яго думку, цяпер галоўнае — выконваць дзяржаўныя праграмы: развіцця малых і сярэдніх гарадоў і паселішчаў, адраджэння вёскі і будаўніцтва жылля. Гэта «паравоз», які пацягне за сабой усю эканоміку.

— Крызіс будзе працягвацца, і не варта спадзявацца на тое, што прыйдзе нехта, дасць грошы і вырашыць усе праблемы, — папярэдзіў Барыс Батура. — Трэба працаваць, круціцца. І дэпутаты павінны не стаяць у баку, а выкарыстоўваць свой статус і падключацца да вырашэння праблем. Павінна быць агульная кансалідацыя грамадства для таго, каб выжыць і стаць больш моцнымі.

Падчас завяршэння сесіі ўзнагароды атрымалі пераможцы штогадовага абласнога спаборніцтва мясцовых органаў самакіравання. Лепшым сельсаветам стаў Вяйнянскі ў Магілёўскім раёне: ён спрацаваў летась без датацый, і сёлетні бюджэт сельсавета таксама сфарміраваны як бездатацыйны. **Старшыня сельскага Савета Мікалай ЧАРАНКОЎ** атрымаў пераходны сцяг і прэмію на добрыя справы ў памеры 500 базавых велічынь.

У конкурсе таксама адзначаны мікразоны. Першым стаў савет грамадскага самакіравання мікразоны № 3 Кастрычніцкага раёна горада Магілёва.

Старшыня Лапаціцкага сельскага Савета Слаўгарадскага раёна стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі (100 базавых велічынь) Магілёўскага аблвыканкама «Чалавек года». У вёсцы Лясная, дзе летась святкавалася 300-годдзе перамогі рускіх войскаў над шведамі, было зроблена ўзорнае добраўпарадкаванне.

**Ілона ІВАНОВА.**

ПОГЛЯД

## ШТО ПАТРЭБНА СЕЛЯНІНУ? ПАРЫТЭТ ЦЭНАЎ

Прачытаў у вашай газеце за 11 лютага паведамленне аб зніжэнні закупачных цэнаў на малако на 10 працэнтаў. Не ведаю, пра што думалі высокія чыны на плошчы Незалежнасці, чым кіраваліся. Ва ўсякім разе клопат пра вяскоўца, пра харчовую бяспеку краіны тут, на мой погляд, не прасочваецца.

Пачнём з інтарэсаў селяніна, таго, хто трымае ў гаспадарцы адну або некалькі кароў. Здаецца, што тут спрацаваў прынцып: «колькі авечку ні стрыжы — шэрсць на ёй усё адно адрасце». І «стрыглі» нас усе ўлады, якія толькі ні былі. Але, прабачце за гэта параўнанне, колькі яшчэ засталося на вёсцы тых «авечак», якія трымаюць кароў і здаюць дзяржаве малако?

Статыстычныя звесткі сведчаць аб рэзкім змяншэнні пагалоўя кароў у прыватным сектары. Напрыклад, у нашай немалой вёсцы яшчэ гадоў дзесяць таму было 75 кароў, а зараз толькі 33. Не памылюся, калі скажу, што падобнае становішча характэрна і для іншых вёсак. А можа, наша прадукцыя ўжо нікому не патрэбная? Але напярэдадні сусветнага крызісу паўсюдна ішла гаворка пра тое, што прадукцыя харчавання зараз запатрабаваная ў свеце, і ў нас у краіне неабходна нарошчваць яе вытворчасць. Было прынята рашэнне аб аднаўленні і рэканструкцыі фермаў. А якія туды «ўбухалі» сродкі!

Паніжэнне цэнаў ударыць таксама і па калгасах. Але што ім — дзяржава падтрымлівае датацыямі. А селяніна? Датацыі тут таксама ёсць. Але што такое, напрыклад, 500 тысяч за 5 тон здадзенага малака? Гэта 100 рублёў датацыі на 1 літр малака. Дык што, выходзіць, гэта нашы ўласныя праблемы, і так будзе працягвацца далей?

Сяляне-прыватнікі даюць у цэлым да 30 працэнтаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Скажыце, ці многа датацый ад дзяржавы яны атрымліваюць? А калгасам ужо на гэты год, як паведамлялася, запланавана 4,8 трыльёна беларускіх рублёў датацыі. А што будзе, калі сяляне пакінуць кароў толькі для сваіх патрэбаў? Зразумела ж, што людзям выгадней купіць якаснае, свежае малако ў суседкі за 1000 рублёў, чым у краме за 1500. А ці падумаў хто, як адаб'ецца крызіс на жывёлагадоўлі ў калгасах? Няхай толькі на адну пасяўную або ўборачную не дадуць у калгасы саляркі — чым тады будзем карміць калгаснае пагалоўе? Не застанецца яго і ў селяніна… Аднавіць жа яго будзе няпроста — патрэбны немалы час і яшчэ большыя сродкі.

Што патрэбна селяніну? Парытэт цэнаў. Давайце разам успомнім той час, калі малако мы здавалі па 28 капеек за літр, буханка хлеба тады каштавала 18 капеек, а літр бензіну — 20 капеек. Палічыце, колькі цяпер пры такіх суадносінах цэнаў павінна каштаваць малако, калі кошт хлеба — 1500 рублёў, а кошт бензіну — 2000 рублёў? Прыкладна 2 тысячы за літр! А што маем мы?

Матывам для зніжэння цэнаў з'яўляецца змяншэнне стратаў перапрацоўчых прадпрыемстваў пры экспарце прадукцыі, што вырабляецца з малака. А як жа раней працавала перапрацоўчая галіна? Чаму зноў крайнім становіцца селянін? Ці я ўсё ж у нечым памыляюся?

Прашу адгукнуцца на паднятую праблему ўсіх зацікаўленых.

**З павагай, І.Л. КВАЧ,**
*Шаркоўшчынскі раён, в. Жукоўшчына.*

# ТВОЙ ПРАДСТАЎНІК У САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

## ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

***АВЕРЫН***
***Віктар Сяргеевіч***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці**

Нарадзіўся 5 ліпеня 1954 года ў г. Магілёве. Закончыў Маскоўскую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ветэрынарную акадэмію імя К.І. Скрабіна. Доктар біялагічных навук.

З 2007 года — дырэктар рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут радыялогіі».

***ДВОРНІК***
***Уладзімір Андрэевіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве**

Нарадзіўся 16 красавіка 1963 года ў в. Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут.

З 1996 года — дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.

Дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны.

***ДЗЮЖАЎ***
***Андрэй Анісімавіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах**

Нарадзіўся 30 жніўня 1959 года ў г. Запарожжа. Закончыў Запарожскі машынабудаўнічы інстытут.

З 2006 года — генеральны канструктар па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь — дырэктар рэспубліканскага канструктарскага ўнітарнага прадпрыемства «ГСКБ па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы».

Дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

***ЖОРАВА***
***Маргарыта Анатольеўна***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве**

Нарадзілася 26 лютага 1956 года ў г. Навазыбкаве Бранскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 1989 года — намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджана ордэнам Пашаны.

***ЛАПАЦІНА***
***Ганна Люцыянаўна***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці**

Нарадзілася 2 жніўня 1955 года ў в. Гожа Гродзенскага раёна. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут.

З 2003 года — галоўны ўрач установы «Гомельскі абласны клінічны кардыялагічны дыспансэр».

Дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Удастоена знака «Выдатнік аховы здароўя».

***НАВУМЧЫК***
***Ала Аляксандраўна***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

Нарадзілася 24 снежня 1960 года ў пас. Вясёлы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Гомельскі кааператыўны інстытут Цэнтрасаюза, Львоўскі гандлёва-эканамічны інстытут. Кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

З 2002 года — рэктар установы адукацыі «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».

Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку».

***СКАРАБАГАТАЎ***
***Віктар Іванавіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах**

Нарадзіўся 28 сакавіка 1958 года ў г. Гомелі. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут.

З 2002 года — галоўны энергетык рэспубліканскага даччынага аўтатранспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтобусны парк № 1» г. Гомеля.

***ЯКАБСОН***
***Аляксандр Серафімавіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**

Нарадзіўся 18 красавіка 1951 года ў г. Гомелі. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання Камуністычнай партыі Беларусі.

З 2001 года — старшыня Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені і Пашаны.

# АПТЫМІЗАВАЦЬ, НЕ ПАШЫРАЮЧЫ ШТАТ?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Спецыяліст 2-й катэгорыКрысціна ШАБЛОЎСКАЯ адказвае за «Адно акно».

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Менавіта для спрашчэння сістэмы пошуку інфармацыі і з'явілася ў Бараўлянскім сельвыканкаме «Адно акно» — невялікі камп'ютарызаваны кабінет на першым паверсе адміністрацыйнага будынка. Сюды сцякаюцца ўсе неабходныя звесткі, і менавіта тут чалавек, які зайшоў у сельвыканкам, атрымлівае поўную інфармацыю аб тым, куды і да каго яму трэба звярнуцца са сваім пытаннем. А магчыма, наведвальніку і не давядзецца нікуды звяртацца — шэраг даведак можна атрымаць, што называецца, не сыходзячы з месца, у гэтым жа кабінеце (напрыклад, аб жыллёвых умовах, аб складзе сям'і і іншыя).

— Спецыялісту, які працуе ў «Адным акне», мы вырабілі пячатку і дэлегавалі права подпісу. Ён выдае даведку, ставіць пячатку — і чалавеку ўжо не трэба падымацца на другі паверх, тыкацца ва ўсе дзверы і высвятляць, дзе ён можа атрымаць патрэбную паперку, — кажа Аляксандр Савончык. — Дзякуючы «Аднаму акну» на першапачатковым этапе вырашаецца значная частка пытанняў, з якімі раней людзі стаялі ў чэргах пад кабінетамі.

Каб спрасціць працэс атрымання інфармацыі, у сельвыканкаме зрабілі і растыражавалі спецыяльныя малафарматныя «тэматычныя» буклеты для наведвальнікаў, напрыклад, «Даведнік Бараўлянскага сельвыканкама» (з прозвішчамі і тэлефонамі), «Пералік дакументаў, неабходных для рэгістрацыі грамадзян па месцы знаходжання», «Куды звярнуцца?» (пералік арганізацый Мінскага раёна, дзе выдаюць патрэбныя даведкі) і іншыя. Іх таксама можна атрымаць на першым паверсе адміністрацыйнага будынка сельвыканкама — у кабінеце «Адно акно».

Праўда, многія грамадзяне разумеюць сэнс паслуг «Адно акно» літаральна: сёння прынёс заяву — заўтра атрымаў патрэбныя дакументы, незалежна ад аб'ёму працэдуры. Насамрэч «акно» бярэ на сябе спрашчэнне толькі тых працэдур, якія выконваюцца на месцы. Што ж датычыцца іншых пытанняў (скажам, зямельных), імі займаецца ўжо непасрэдна землеўпарадчык.




**Многія грамадзяне разумеюць сэнс паслуг «Адно акно» літаральна: сёння прынёс заяву — заўтра атрымаў патрэбныя дакументы.**

— Інакш кажучы, хадзіць людзям усё адно давядзецца, мы гэтага не пазбегнем. Напрыклад, каб стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, трэба ў абласным агенцтве па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры браць даведку аб адсутнасці ўласных «квадратных метраў» (гэта робіць або сам грамадзянін, або сельвыканкам). Але думаю, што ў хуткім часе такія даведкі можна будзе таксама атрымліваць па камп'ютары, — упэўнены Аляксандр Савончык.

Бараўлянскі сельсавет абыходзіцца сёння без датацый — у бюджэце застаюцца зямельны падатак, падатак на нерухомасць і арэндная плата. А таксама грошы, атрыманыя ад продажу зямельных участкаў праз аўкцыён. Але «свабодных» участкаў на тэрыторыі сельсавета ўжо практычна не засталося.

Грошы, якія паступаюць у агульную сельсавецкую «кішэню», выдаткоўваюцца на добраўпарадкаванне тэрыторыі, давядзенне да ладу дарог (многія з іх яшчэ не перададзены на баланс спецыялізаваных арганізацый і таму па-ранейшаму лічацца «сельсавецкімі»), газіфікацыю і электрыфікацыю вёсак, рамонт водаправоду.

— У нас толькі за мінулы год нарадзілася больш за 370 чалавек. А моладзі ўжо сёння няма куды вечарам падзецца. Ёсць клуб, але там можна хіба што кіно паглядзець. Не хапае плошчаў для работы гурткоў — яны літаральна туляцца пры школах... У цэнтральным пасёлку хацелася б разбіць прыгожы парк, пабудаваць фізкультурна-аздараўленчы комплекс, урэшце, адкрыць прыстойную кавярню для моладзі — не ездзіць жа ім увесь час у сталіцу, — дзеліцца сваімі планамі на будучыню старшыня сельскага Савета. Ці выканальныя яны? Ва ўсякім разе, праблемы прысталічнага сельсавета часткова павінны вырашыцца ўжо ў гэтым годзе — пасёлак Лясны ўключаны ў праграму будаўніцтва аграгарадкоў. Адсюль вынікае, што ў хуткім часе павінна з'явіцца і дадатковае фінансаванне (на рамонт дарог, школ, крамаў, дома быту, дворовых тэрыторый і г.д.).

— Са старымі дварамі — тэрыторыямі пяціпавярховікаў, якія будаваліся яшчэ ў 60-х, — увогуле вялікая праблема. Будзем іх асфальтаваць, рабіць спартпляцоўкі — футбольныя і баскетбольныя, надаваць прывабны знешні выгляд... Так што прыязджайце сюды праз год — паглядзім, што зменіцца.

...Выходзячы з адміністрацыйнага будынка, прыхапіла (з дазволу старшыні сельскага Савета) некалькі буклетаў-даведнікаў — на той выпадак, калі хто-небудзь з калег Аляксандра Савончыка зацікавіцца гэтым «ноу-хау».

**Наталля КАРПЕНКА.**

# ДАКУМЕНТАЎ ХАПАЕ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

**— Калі мы робім стаўку на прадпрымальніцтва, чаму ў нас так мала суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва (на тэрыторыі Мінскай вобласці іх — разам з Барысаўскім цэнтрам — усяго тры)?**

— За ўсе суб'екты казаць не буду, патлумачу сітуацыю на прыкладзе нашага цэнтра. Мы не атрымліваем датацый з бюджэту і выжываем выключна за кошт сваёй дзейнасці. Як камерцыйная арганізацыя, мы павінны самастойна зарабляць грошы, і пры гэтым, як цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва, выконваць сваю асноўную функцыянальную задачу — дапамагаць прадпрымальнікам. Для бізнэсу гэта нонсэнс: укладваць зароблены грошы ў тое, што не прынясе прыбытку. Да нас у асноўным звяртаюцца людзі, якія толькі распачынаюць сваю дзейнасць. У іх яшчэ няма грошай. З гэтай прычыны практычна ўсе паслугі нашага цэнтра аказваюцца на льготнай, альбо ўвогуле на бясплатнай аснове. А для саміх цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва сёння не прадугледжаны ніякія льготы. Асноўная доля выручкі, якую атрымлівае наш цэнтр (каля 45 працэнтаў), траціцца на арэнднаю плату (замест таго, каб расходаваць гэтыя грошы на дапамогу прадпрымальнікам). Мы плацім па поўнай, у той час як для гандлёвых арганізацый існуюць зніжкі (яны плацяць 0,4 стаўкі арэнднай платы). У нас няма такіх прывілеяў, а рэшткі выручкі мы расходуем на развіццё — у тым ліку і гандлёвых суб'ектаў. Улічыце яшчэ, што гандлёвыя арганізацыі арандуюць значныя плошчы, у адрозненне ад цэнтраў падтрымкі. Такім чынам, пры ўвядзенні для нас льгот па арэндзе страты дзяржавы былі б мізэрнымі, а карысць для развіцця прадпрымальніцтва відавочная.

Цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва маглі б і самастойна знайсці сродкі — за кошт прыцягнення грантаў, аднак мы не можам гэтага зрабіць, пакуль з'яўляемся камерцыйнай структурай (грантадаўцы з камерцыйнымі структурамі не працуюць). На Захадзе такія цэнтры, як наш, лічацца непрыбытковымі і маюць права карыстацца любой фінансавай падтрымкай, у тым ліку і грантамі. Акрамя таго, ва ўсім цывілізаваным свеце такія цэнтры на 60-70 адсоткаў датуюцца са сродкаў дзяржавы. У Польшчы падобныя цэнтры яшчэ цалкам вызвалены ад выплаты падаткаў і арэнды. Там разумеюць, што цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва — гэта той інстытут гаспадарання, які ініцыюе стварэнне новых працоўных месцаў. Калі і ў нас гэта нарэшце зразумеюць і пачнуць аказваць падтрымку, тады, магчыма, цэнтры будуць актыўна развівацца, а з імі і прадпрымальніцтва.

**— Акрамя фінансавага аспекту, якія яшчэ моманты ўскладняюць работу цэнтраў падтрымкі і тармозяць развіццё прадпрымальніцтва ў рэгіёнах?**

— Асноўнай мэтай цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва з'яўляецца забеспячэнне сувязі паміж органамі дзяржаўнага кіравання і прадпрымальніцкім асяроддзем. Цэнтры падтрымкі прызначаны быць «сувязным звяном», а ў нас сёння гэтай сувязі практычна няма — у мясцовых органаў кіравання адсутнічае зацікаўленасць у супрацоўніцтве з такімі цэнтрамі і ў развіцці прадпрымальніцтва. Сёння ў камісіях і структурах, якія разглядаюць пытанні развіцця прадпрымальніцтва ў рэгіёне, практычна няма прадпрымальнікаў, няма абаронцаў іх інтарэсаў. Атрымліваецца, што лёс прадпрымальніцтва вырашаюць чыноўнікі, далёкія ад праблем бізнэсу. Для многіх чыноўнікаў яшчэ і сёння прадпрымальніцтва — галаўны боль. Хоць насамрэч гэта новыя працоўныя месцы, гэта папаўненне бюджэту. Адзіны падатак, які бярэцца з прадпрымальнікаў, залічваецца менавіта ў мясцовы бюджэт, а значыць, усе чыноўнікі павінны дзень і ноч дбаць пра тое, каб больш актыўна развіваць прадпрымальніцтва ў сваім рэгіёне.

Зрухі ёсць, але іх, на мой погляд, яшчэ недастаткова для таго, каб прадпрымальніцтва развівалася тымі тэмпамі і ў тых аб'ёмах, якія неабходны дзяржаве.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Барысаўскі р-н.*

## ПАЛЕПШЫЛІ ЎМОВЫ

**На сесіі Аршанскі раённы Савет дэпутатаў узаконіў перайменаванне Панізоўскага сельсавета ў Бабініцкі.**

Перамены матываваныя тым, што самы буйны населены пункт на тэрыторыі сельсавета — пасёлак Бабінічы— атрымаў статус аграгарадка. Вакол пасёлка сканцэнтраваны буйныя прадпрыемствы: жывёлагадоўчыя комплексы і птушкафабрыка. А дзе больш народу, там павінна базіравацца і мясцовая ўлада.

Пад сельвыканкам выдзелены дыхтоўны будынак, у кабінетах прыбавілася сучаснай аргтэхнікі, абнавілі мэблю.

**Вольга ШУТАВА.**

# СТАРАСТА Ў ВЁСЦЫ — ВАЖНАЯ ФІГУРА

**Семінар-нарада ў Івацэвічах падвёў вынікі работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання Брэстчыны за год.**

Гэта традыцыйная форма работы, калі на нараду збіраюцца старшыні райсаветаў, выканкамаў, сельскіх Саветаў і абмяркоўваюць надзённыя праблемы жыцця вёсак і райцэнтраў. На гэты раз прадстаўнічы форум прайшоў з удзелам старастаў вёсак. Вялікая група іх была запрошана на семінар.

У сваім выступленні старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар адзначыў, што ў сельсаветах вобласці летась праведзена вялікая работа па добраўпарадкаванні тэрыторый, паляпшэнні знешняга выгляду вёсак. Актыўная пазіцыя старшынь сельвыканкамаў і старост дазволіла вырашыць многія надзённыя пытанні жыцця грамадзян. Але не заўсёды і не ўсюды да праблемаў людзей ставяцца ўважліва, дзейнічаюць аператыўна.

Напярэдадні правядзення мерапрыемства была вывучана сітуацыя ў шэрагу сельсаветаў, праведзена апытанне сярод вяскоўцаў на прадмет ацэнкі імі дзейнасці сельсаветаў і старост. У многіх месцах выказана станоўчая ацэнка, але прагучала і шмат крытыкі. Людзі скардзіліся на тое, што паша для жывёлы знаходзіцца далёка ад вёскі, што аўталаўка з таварамі заязджае позна ўвечары, што аўтобус праходзіць за тры кіламетры ад населенага пункта. Жыхары вёскі Радастава Драгічынскага раёна, напрыклад, наракалі на праблемы з выпасам кароў, на дзяльбу ўчасткаў пад бульбу, на хібы ў добраўпарадкаванні вуліц і дарог. Праблемы, падобныя на гэтыя, перыядычна ўзнікаюць і ў іншых раёнах.

Асаблівы ўпор на нарадзе быў зроблены на безумоўную падтрымку асабістай гаспадаркі вяскоўцаў. Губернатар запатрабаваў ад органаў улады на месцах усяляк дапамагаць і з кармамі, і з пашай для жывёлы. Вяскоўцы здаюць штогод тысячы тон малака і мяса. Іх гаспадарка каштоўная яшчэ і тым, што яны падтрымліваюць гарадскіх дзяцей і прадуктамі, і грашыма. Асабліва гэта важна ў цяперашняй сацыяльна-эканамічнай сітуацыі.

Вельмі адкрыта, часам эмацыянальна пра свае праблемы гаварылі старасты вёсак. Іх выбіраюць аднавяскоўцы, часам ім даводзіцца быць «і старастам, і псіхолагам, і следчым» без усялякай спецыяльнай адукацыі, абапіраючыся толькі на асабісты жыццёвы вопыт. За гэта іх і ўшанавалі. Лепшыя старасты атрымалі ў гэты дзень граматы і прэміі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АДЭКВАТНЫЯ ЗАКОНЫ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Дарога Брэст — Масква будавалася да Алімпіяды-80 наводдаль ад гарадоў і вёсак. І цяпер, калі хочаш паставіць на краі дарогі нейкі шынок ці гатэльчык, трэба «цягнуць» электрычнасць, ваду, каналізацыю. Атрымліваецца вельмі дорага. Таму не спяшаюцца інвестары.

А вось у заканадаўчую базу, якая датычыць спагнання даўгоў з абавязаных асобаў, лічыць Леанід Цупрык, трэба ўнесці некаторыя змены. Ісці неабходна ад рэалій. Пэўная частка гэтых людзей знаходзіцца на грані дэградацыі, працаваць іх не прымусіш, бо любая работа патрабуе хоць нейкай ступені адказнасці, а гэтым людзям нічога даверыць нельга. І сумы грошай, якія яны павінны вяртаць дзяржаве, можна перагледзець. З гэтай сумы варта вылічыць гарантаваныя Канстытуцыяй выдаткі на бясплатную адукацыю і ахову здароўя, датацыі на школьнае харчаванне, якія атрымліваюць дзеці з нармальных сем'яў. Тады сумы, якія паменшацца, лягчэй будзе спаганяць.

Яшчэ Леанід Цупрык узняў вельмі актуальную для грамадства праблему падрыхтоўкі спецыялістаў. Кадры павінны рыхтавацца пад патрэбу, каб не было ў нас «таксістаў — чытай юрыстаў і эканамістаў». Гэта вельмі дарагое задавальненне для дзяржавы. Патрэбны рэальныя разлікі прадпрыемстваў і ўстаноў, падрабязны аналіз па галінах патрэбы ў кадрах на значныя адрэзкі часу.

Тэму падтрымаў член Савета Рэспублікі Міхаіл Куіш, дырэктар Брэсцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа сувязі. Штогод навучальная ўстанова вымушана, вобразна кажучы, наступаць на адны і тыя ж граблі. Каледж гатовы, паводле слоў дырэктара, працаваць пад поўны заказ прамысловасці, сельскай гаспадаркі, установ. Але такой магчымасці няма, навучэнцы паступаюць на конкурснай аснове. На практыцы гэта выглядае так: 1 верасня ў аўдыторыі прыходзіць большасць брэстаўчан. Але на пошты і ў арганізацыі электрасувязі абласнога цэнтра спецыялісты не патрабуюцца — іх просяць райцэнтры, пасёлкі, аграгарадкі. Малады ж брэстаўчанін альбо не паедзе туды наогул, альбо паедзе на год. А каледж мог бы сам збіраць заяўкі з усіх рэгіёнаў і фарміраваць групы навучэнцаў, якія дакладна вярнуліся б працаваць у родныя мясціны. А вось права такога ў навучальнай установы няма.

З антыкрызіснай праграмай сваёй гаспадаркі СВК «Астрамечава» пазнаёміў калег член Савета Рэспублікі, старшыня СВК Аляксей Скакун.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Брэсцкі раён.*

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**

**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**

**НАВІЦКІ Г.В.,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**

**БАЙКОЎ В.М.,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце**

**АЦЯСАЎ А.Я.,**
**старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў**

**СЦЕПАНЕНКА А.М.,**
**адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**ПРЭДКА С.У.,**
**старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці**

**МАКСІМЕНКА С.А.,**
**старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці**

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:**
**Наталля КАРПЕНКА.**
***Кантактны тэлефон 292 21 03.***

Свая кішэня

# ЯК ВЫРВАЦЦА з «фінансавай блакады»,

## альбо Законныя спосабы здабычы грошай у цяжкую хвіліну

**Тэму крызісу сёння закранаць не хацелася б. Ды і ўвогуле, на мой погляд, пра яго пакуль, на шчасце, больш размоў і прагнозаў, чым ад яго ж — рэальных глабальных негатыўных наступстваў для большасці з нас. А што да пэўных складанасцяў, у тым ліку і фінансавых, дык у асобнага чалавека ці сям'і яны могуць узнікаць час ад часу і без таго. Атрымаў меншую, чым разлічваў, прэмію на працы, здарыліся пазачарговыя, але неабходныя выдаткі, запланаваў буйную пакупку, рамонт, адпачынак — грошы патрэбныя заўсёды, лішнімі яны не бываюць. Вядома ж, бывае і так, што фінансавае становішча ўскладняецца катастрафічна імкліва і патрабуе такіх жа «пажарных» спосабаў дзеяння. Таму падчас нашага даследавання спосабаў заробку дадатковых грошай мы нашу «цяжкую хвіліну» ўмоўна падзелім на два складнікі.**

**Першая з іх датычыцца сітуацый, калі сродкі патрэбныя тэрмінова. Няхай невялікая сума, але, як кажуць, прама зараз. Другая, калі мы разлічваем на большыя фінансавыя паступленні на працягу нейкага пэўнага часу, разумеючы пры гэтым, праўда, што і высілкаў па іх здабычы можа спатрэбіцца больш.**

**Пагаворым пра асноўныя спосабы «здабычы» фінансаў, выходзячы з канкрэтных плюсоў і мінусаў, што суправаджаюць кожную з двух нашых складнікаў.**

### Пазыка і крэдыт — выйсце?

І ў першым, і ў другім выпадках самы просты спосаб вырашыць грашовую праблему: пазычыць патрэбную суму — у блізкіх ці родных або звярнуцца ў банк па крэдыт. У цяжкую хвіліну гэта можа быць выйсцем, але трэба памятаць, што, па-першае, бяром мы чужыя грошы і на час, а аддаём свае і назаўсёды. Па-другое, давядзецца вяртаць не толькі суму асноўнага доўгу, але і працэнты за карыстанне крэдытам (няўжо вы не аддзячыце сваяка, які вас выручыў — у любой фінансавай-таварнай форме?).

Калі гаварыць асобна пра банкаўскія ўстановы, дык цяпер, напрыклад, **ААБ «Беларусбанк»** дае крэдыты ў беларускіх рублях на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і кватэр на наступных умовах. Іх можна атрымаць тэрмінам да 15 гадоў у памеры да 75 працэнтаў ад кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) агульнай плошчы жылога памяшкання. Пры гэтым грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уносяць працэнты за карыстанне крэдытам у памеры 17 працэнтаў гадавых (гэта апошняя інфармацыя па адкрытых крэдытных лініях па дагаворах, заключаных з такімі грамадзянамі з 12 студзеня — выдача крэдытаў пад 17 працэнтаў ажыццяўляецца з 2 лютага пры ўмове заключэння дадатковых пагадненняў) шляхам унясення раўнамерных узносаў на працягу ўсяго перыяду пагашэння. Грамадзяне, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выплачваюць 25 працэнтаў гадавых за фактычны час карыстаннем крэдыту.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Грамадзяне, якія пастаянна пражываюць, працуюць і будуюць (займаюцца рэканструкцыяй) жылыя памяшканні ў сельскіх населеных пунктах (як асобы з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў), выплачваюць працэнты ў памеры 16 працэнтаў гадавых шляхам унясення раўнамерных узносаў на працягу ўсяго перыяду пагашэння.

Шматдзетным сем'ям, якія маюць траіх і больш няпоўнагадовых дзяцей і якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, крэдыты даюцца ў памеры да 95 працэнтаў кошту з выплатай працэнтаў у памеры стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка шляхам унясення раўнамерных узносаў на працягу ўсяго перыяду пагашэння. Пры змяненні Нацыянальным банкам памеру стаўкі рэфінансавання адпаведна змяняецца і працэнтная стаўка па дзейных крэдытных дагаворах.

Крэдыты пад розныя мэты можна паспрабаваць атрымаць і ў іншых банках. Праўда, трэба мець на ўвазе некалькі момантаў. Працэнтныя стаўкі ў параўнанні з нядаўнім часам маглі павялічыцца, некаторыя крэдыты стала атрымаць больш складана. Вядома ж, памятаць пра ўзнагароджанні банка, якія бяруцца апошнім пры крэдытаванні ў незалежнасці ад працэнтаў за карыстанне крэдытам.

**Плюсы:** прыдатны спосаб, калі патрэбна буйная сума; падыходзіць найперш шматдзетным сем'ям пры будаўніцтве жылля; блізкія члены сям'і могуць даць беспрацэнтную пазыку і на працяглы тэрмін.

**Мінусы:** узровень даходаў можа не дазволіць узяць крэдыт на патрэбную суму; з вялікага крэдыту за час карыстання ім «набягае» прыстойная лічба працэнтаў; некаторыя крэдыты нельга пагасіць датэрмінова.

### Што з падпрацоўкай?

Разважаючы лагічна, кожны чалавек павінен сам задавальняць уласныя патрэбы. Многія гэта робяць з дапамогай зарплаты. Але, па-першае, у некаторых выпадках яе памер, як кажуць, вымушае чакаць лепшага, па-другое, і патрэбы могуць расці. Два месцы працы адразу сумяшчаць можа не кожны, а вось знайсці падпрацоўку па сілах некалькі прасцей.

Вывучыўшы рэкламныя аб'явы ў газетах, праглядзеўшы некаторыя сайты ў інтэрнэце, можна меркаваць, што менавіта ў якасці падпрацоўкі найбольш падыходзяць наступныя «пазіцыі»: вахцёр, вартаўнік, кур'ер, нянька, швачка, вадзіцель, ахоўнік, аператар ПК, упакоўшчыца, расклейшчык аб'яў, прыбіральшчыца і некаторыя іншыя.

Раіць нешта абстрактнае наконт працы на тым ці іншым месцы не хацелася — у кожнага свае магчымасці (працягласць працоўнага дня на асноўным месцы працы, месца жыхарства) і пажаданні (магчымы ўзровень заробкаў і ўмовы падпрацоўкі). Умоўна прымераў сітуацыю на сябе. Вольны час у мяне толькі дастаткова позна ўвечары ды ў выхадныя (і тое не ў кожныя). Каб жыццё прымусіла шукаць дадатковую крыніцу ў такіх умовах, куды б кінуў позірк? Прыцягнула ўвагу аб'ява з прапановай працы кур'ера — кідаць бясплатныя газеты ў паштовыя скрыні гараджан. Рэжым працы — адзін раз на тыдзень. Да пад'езда табе падвозяць пачкі газет: усяго 23, кожная вагой 7 кілаграмаў. За раз трэба раскласці па скрынях 2300 асобнікаў рэкламнага выдання. Думаю, гэтай працай можна было б займацца і позна ўвечары (самому ў кватэру ў гэты час па дамафоне неаднойчы званілі такія кур'еры — каб у пад'ездзе дзверы адчыніў). Такім чынам, за чатыры падобныя выхады на працу ў месяц абяцалі 180 тысяч рублёў. Няшмат, але і высілкі не надта вялікія. Адзінае, у гэты момант фірме не патрэбны былі работнікі, якія, як я, пражывалі ў маім мікрараёне: у іх была неабходнасць у іншай «геаграфіі» горада.

**Плюсы:** можна падабраць працу пад уласны рэжым дня і магчымасці; займацца нават некалькімі падпрацоўкамі.

**Мінусы:** адносна невялікі заробак; часам трэба мець уласны аўтамабіль ці пэўныя прафесійныя навыкі; абмежаванні па ўзросце (скажам, для кур'ера — ад 20 гадоў).

### Накольк паперы каштоўныя?

У многіх людзей захоўваюцца каштоўныя паперы, напрыклад, акцыі адкрытых акцыянерных таварыстваў. Накольк яны могуць быць такімі ў грашовым вымярэнні? Даследуем і гэтую тэму.

Паводле звестак **дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў**, у іх маецца справаздача пра вынікі дзейнасці каля 1700 адкрытых акцыянерных таварыстваў (тых, што яе падалі) па стане на трэці квартал мінулага года (гэта самыя апошнія звесткі, больш свежых пакуль няма). Сотні з іх у памер дывідэндаў, што выпадалі на адну акцыю (уключаючы падаткі), на гэты тэрмін налічвалі 0 рублёў. Лічбы ў 100—200—300 рублёў таксама вельмі сур'ёзнымі не назавеш. Так, былі і ААТ, дзе выплачвалі сур'ёзныя грошы — і 50, і 60 тысяч на акцыю. Абсалютны рэкорд у гэтым своеасаблівым рэйтынгу — 1 718 723 рублі дывідэндаў на акцыю. Але праблема ў тым, што такіх адкрытых акцыянерных таварыстваў у параўнанні з іх агульнай колькасцю было не так шмат, як хацелася б, адпаведна, і шчасліўцаў сярод трымальнікаў гэтых каштоўных папер таксама будзе не вельмі многа. А калі акцыі прадаць? Хоць бы аднаразова, але зарабіць пэўную суму грошай?

— Другаснага рынку каштоўных папер зараз фактычна няма, ён толькі набірае абароты, хоць уся патрэбная інфраструктура ўжо маецца. Калі фізічная асоба, што валодае акцыямі адкрытага акцыянернага таварыства, пажадае іх прадаць, зрабіць гэта можна будзе толькі праз біржу. А для гэтага абавязкова патрэбна звярнуцца да брокера, якому трэба будзе заплаціць камісійныя, — спусціў з нябёсаў на зямлю начальнік упраўлення па каштоўных паперах Галоўнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў па г. Мінску Віктар Амельяновіч. — За чэкі «Маёмасць» грамадзянін раней фактычна бясплатна мог атрымаць 5—10, ну 20 акцый адкрытага акцыянернага таварыства. Атрымаць за іх чалавек у выпадку продажу зможа тыя ж 10-15-20 тысяч рублёў. Цана на акцыю залежыць ад двух фактараў: памераў дывідэндаў на яе (даходнасці) і стаўкі банка ў працэнтах. А за паслугі па продажы акцый грамадзянін можа заплаціць 70—100 тысяч рублёў. А прадаваць, як вы кажаце, высокадаходныя акцыі — які тут здаровы сэнс? А ў цэлым можна сказаць, што сітуацыя на другасным рынку каштоўных папер, магчыма, зменіцца пасля 30 чэрвеня 2010 года, калі будзе зняты мараторый на адчужэнне для фізічных асобаў.

**Плюсы:** на дадзены момант адсутнічаюць, калі толькі не гаварыць пра валоданне акцыямі ААТ, па якіх выплачваюць прыстойныя дывідэнды; прадаваць іх не варта.

**Мінусы:** для многіх датычацца як у сэнсе памераў дывідэндаў, так і немагчымасці пакуль продажу за прыстойныя грошы саміх акцый.

*(Працяг будзе.)*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прамая лінія

# УСЁ ЛЕПШАЕ — СЭРЦУ

**Карысныя падказкі падчас «прамой лініі» далі загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг блока інтэнсіўнай тэрапіі таго ж аддзялення Ірына ГРЫШЫНА.**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 21, 24 лютага.)**

***☎ — Ірына Аляксееўна. 49 гадоў. Шмат гадоў — тахікардыя. Варта крыху пахвалявацца, як сэрца пачынае стукаць як у зайца. Якім можа быць лячэнне?***

— Тахікардыя — гэта не асобны стан, а сімптом нейкага захворвання. Гэта можа быць захворванне шчытападобнай залозы, таму варта зрабіць ультрагук і праверыць гармоны шчытападобнай залозы. Гэта можа быць пачатак ішэмічнай хваробы сэрца, гіпертэнзіі. Таму спачатку трэба дакладна вызначыць дыягназ. Наогул чым меншая частата сардэчных скарачэнняў, тым лепш.

***☎ — Добры дзень. Валожынскі раён, Зоя Рыгораўна. Мне 75 гадоў. Маю гіпертанію II ступені. Больш як 5 гадоў прымаю берліприл 5 мг. Аднак ціск нестабільны, часта павышаецца, можа зашкаліць і за 200. Магчыма, мне трэба прымаць іншыя прэпараты?***

— Калі вы бачыце, што ціск пачынае павышацца, я раіла б прымаць берліприл 10 мг, можна пакласці пад язык 1—2 таблеткі каптапрылу ці прыняць 40—50 кропель карвалолу. Але гэта — як хуткая дапамога. Калі ж з'явіцца болі ў сэрцы і ціск працягвае расці далей, трэба выклікаць доктара. Надалей дадаць да лячэння іншыя прэпараты.

***☎ — Ніна, Свіслацкі раён. Мне 58 гадоў. З 1971 года высокі ціск — 170/110. Літаральна сяджу на таблетках. Пад вечар ціск павышаецца, можа быць 230/120. Раніцай зніжаецца, бо я яго збіваю. Але ўсё роўна менш чым 100 не бывае. Пастаянныя галаўныя болі. Прымаю малсідамін, дыратон, індап, панангін. Эфект нязначны. Што вы можаце параіць?***

— Вам трэба адкарэктаваць тэрапію. Зноў звярніцеся да раённага кардыёлага, каб ён перагледзеў схему прыёму лекавых прэпаратаў. Акрамя таго, звярніце ўвагу на рэжым харчавання. Вам паказана ежа без солі або маласалёная. У кардыёлага вы павінны пастаянна назірацца. Магчыма, для падбору прэпаратаў з'явіцца неабходнасць у шпіталізацыі. Гэта вырашыць спецыяліст.

***☎ — Клецк, Тамара Фёдараўна. Мне 49 гадоў. Скажыце, доктар, што гэта за захворванне такое — экстрасісталія. Мне паставілі такі дыягназ, а як лячыцца — не сказалі.***

— Такая паталогія азначае пазачарговыя скарачэнні сэрца. Фізіялагічная норма — 60-80 удараў у хвіліну. Калі ж іх болей, вы адчуваеце дыскамфорт. Гэты стан патрабуе карэкцыі. Звярніцеся да кардыёлага, каб ён вам прызначыў лячэбныя сродкі. Сітуацыю нельга запускаць, трэба лячыцца.

***☎ — Краснаполле, Мікалай Іванавіч, 67 гадоў. Пастаянна адчуваю ныючыя болі ў грудзях злева. У Магілёве мне зрабілі эхакардыяграфію, якая паказала ўмеранае патаўшчэнне аорты, змяненні ў левым жалудачку. Прымаю прэдуктал, дыратон, дылтыязем. Аднак ніжні ціск не магу збіць, ён трымаецца на мяжы 120—130, пастаянна адчуваю стомленасць. Што рабіць?***

— Вы прымаеце нядрэнныя прэпараты. Пры ныючых болях можна прымаць нітраты, напрыклад, нітрагліцэрын кароткага дзеяння. Яшчэ абмяжуйце сабе фізічныя нагрузкі, жывіце ў больш спакойным рэжыме. І вам абавязкова трэба яшчэ раз пайсці да доктара, бо ёсць вялікая небяспека інфаркту, і гэты момант нельга прапусціць.

***☎ — Салігорск, Ларыса Іванаўна. Мне 62 гады. Маю дыягназ — артэрыяльная гіпертэнзія 2-й ступені. Часта адчуваю перапады ціску. Прымаю лізінаприл 5 мг, L-тыраксін, кардыямагніл. На фоне гэтага лячэння быццам наступае паляпшэнне. А потым раптоўна здараецца нібы крыз. Як параіце лячыцца?***

— Я параіла б на фоне вашага лячэння прымаць раніцай лізінаприл 10 мг. Можна ў вашу схему дадаць бэта-блакатары. Папіце таксама заспакаяльныя зборы, бо ў большасці выпадкаў высокі ціск мае псіхасаматычную прыроду. Як мы кажам, усе хваробы ад нерваў. Карыснымі будуць зборы траў з мелісай, сардэчнікам, добра піць зялёны чай з мёдам.

***☎ — Мінск, Надзея Міхайлаўна. Месяц таму на правай назе, ніжэй за калена ў мяне выступіла чырвоная пляма, падобная на капіляр. Што гэта можа быць? І да якога спецыяліста трэба ісці?***

— Ісці трэба да хірурга. Магчыма, так праяўляецца варыкознае расшырэнне венаў. Калі хірург нічога не знойдзе, неабходна будзе рабіць даследаванне сасудаў. Гэта можна зрабіць і ў нашай бальніцы. Аднак лячыць паталогію будзе хірург. Такі стан небяспечны ўзнікненнем тромба, які можа адарвацца. Ідзіце да спецыяліста і ні ў якім разе не займайцеся самалячэннем, каб не выклікаць ускладненняў.

***☎ — Алена, Мінск. У мяне ціск 190/100. Прымаю два разы на дзень эналапрыл-10 мг. Ці правільна я раблю? Ці трэба прымаць часцей?***

— Эналапрыл нельга прымаць больш за 2 разы на дзень. Да гэтага прэпарата варта дадаць прэпараты іншых груп. Парайцеся з участковым кардыёлагам. Акрамя таго, звярніце ўвагу на рэжым харчавання. Вам не рэкамендавана салёная і вострая ежа, бо, ужываючы яе, мы больш п'ём вады, а ў выніку ўзмацняецца нагрузка на сэрца, і ціск павышаецца.

***☎ — Капыльскі раён, Ганна Рыгораўна. Мне 68 гадоў, маю цукровы дыябет. Ад гэтага ціск павышаецца, бывае да 240—260. З'яўляюцца ацёкі лёгкіх. Ляжала ў бальніцы. Пасля таго як выпісалася, далі II групу інваліднасці. Прымаю лізінаприл, карвітон, інсулін. Але адчуваю сябе дрэнна, пастаянная задышка. Што мне можна параіць?***

— Я параіла б замест карвітону прымаць карвідылол. Ён вельмі эфектыўны пры той сардэчнай недастатковасці, якая ёсць у вас, і пры цукровым дыябеце. Але гэты прэпарат робіць радзейшым пульс, таму прымаць яго трэба пад кантролем доктара. Неабходна рэгулярна мераць ціск і піць мачагоннае. Шмат вадкасці дрэнна для сэрца. У дзень можна піць да 1,5 л вадкасці, і гэта разам з сокам, чаем, супам, гароднінай і фруктамі. Абмяжуйце ўжыванне салёнай і вострай ежы.

***☎ — Ніна Пятроўна, Івянец. Сын чатыры гады таму перанёс інсульт. Аднаўляецца дрэнна: рука не працуе, маўленне малазразумелае. Што рабіць?***

— На жаль, інфаркт мозгу — гэта цяжкая хвароба. Зусім аднавіцца, як было раней, наўрад ці атрымаецца. Функцыя мозгу лёгка церпіць і цяжка аднаўляецца. Таму рэабілітацыя будзе доўгая. Я параіла б хоць бы раз на год праходзіць курсы якой-небудзь сасудзістай тэрапіі, таксама трэба займацца лячэбнай фізкультурай.

**Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**

*(Працяг будзе.)*

# ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАННЕ ПАТРАБУЕ ЗРАЗУМЕЛАСЦІ І ДАКЛАДНАСЦІ

**З пачатку года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі. У гэтым дакументе акрэсліваецца шмат чаго новага, што датычыцца зямельных участкаў для жыхароў у блакаваных дамах, аб зямельнай уласнасці для замежнікаў, аб тэрмінах атрымання зямельнай спадчыны, акрэсліваюцца больш гібкія абмежаванні па максімальнай плошчы ўчасткаў для грамадзян і г.д. Акрамя гэтага, згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 64 ад 6 лютага 2009 года, зменены парадак выдачы грамадзянам Беларусі зямельных участкаў для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. Гэты парадак набыцця ўчасткаў без зямельных аўкцыёнаў пачне дзейнічаць з першых дзён мая гэтага года.**

**На гэтыя і іншыя пытанні чытачам выдання на мінулым тыдні адказваў на «прамой лініі» старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій Іванавіч КУЗНЯЦОЎ.**

***☎ — У прыгарадзе сталіцы маю зямельны ўчастак памерам каля 6 сотак, дзе бацькі вырошчваюць агародніну. Ці магчыма нейкім чынам змяніць мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка, каб потым пабудаваць там уласны дом?***

**Дзмітрый Капрусьпка,** *г. Мінск.*

— Калі там распрацаваны генеральны план на гэты населены пункт, па якім прадугледжана будаўніцтва індывідуальнага жылля, тады адпаведныя органы могуць памяняць вам мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка, а вось калі такога генплана няма і гэтая зямля прызначана толькі для вядзення прысядзібнай гаспадаркі, тады застаецца вам на гэтым участку вырошчваць таматы ці моркву.

***— Наш участак зямлі знаходзіцца непасрэдна побач з пасёлкам, дзе дазволена будаваць індывідуальнае жыллё...***

— Гэта не мае прынцыповага значэння. Галоўнае, каб існаваў распрацаваны дакумент, па якім прадугледжана будаўніцтва жылля. Толькі ў гэтым выпадку мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка можа быць зменена.

***☎ — У садаводчым таварыстве недалёка ад сталіцы маю невялікую дачу. Зямельны ўчастак мною прыватызаваны. Маю намер зрабіць да доміка прыбудову. Ці трэба мне ўзгадняць гэтую прыбудову са спецыялістамі? Сусед кажа, што не трэба, бо зямельны ўчастак знаходзіцца ў мяне ў прыватнай уласнасці...***

**Віктар Зуеў,** *г. Мінск.*

— Я вам параіў бы звярнуцца да мясцовага архітэктара і ўзгадніць з ім план пабудовы. Лепш папярэдне атрымаць параду спецыяліста аб тым, як прытрымлівацца адпаведных будаўнічых нормаў. Вы павінны разумець, што пасля завяршэння дадатковага будаўніцтва вам неабходна будзе ўнесці змяненні ў тэхнічны пашпарт аб'екта нерухомасці.

***☎ — У 2005 годзе маці падаравала мне дом. Зямля тады была ў маці ва ўласнасці. Мне як грамадзянцы Расіі зямлю ва ўласнасць не далі...***

**Спадарыня Шастаковіч,** *г.п. Плешчаніцы.*

— У той час зямлю ва ўласнасць або ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну давалі толькі грамадзянам Беларусі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Цяпер, згодна з новай рэдакцыяй Кодэкса аб зямлі, зямлю ва ўласнасць могуць атрымаць у спадчыну і замежныя грамадзяне. Калі была аформлена спадчына?

***— Мы афармілі спадчыну амаль 5 гадоў таму. Зямлю потым перааформілі ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну. Дзяржаўны акт на зямлю ў нас зарэгістраваны.***

— З першых дзён гэтага года грамадзяне Расіі ўжо маюць права аформіць зямлю на сваё імя ў пажыццёвае валоданне або ва ўласнасць.

***☎ — Маю ўласны дом. Тэхнічны пашпарт на пабудову афарміў. Вырашыў для дзетак аформіць усе дакументы на нерухомасць. За рэгістрацыю ўсяго аб'екта, зямлі і дома, трэба заплаціць прыкладна 330 тысяч рублёў. Адначасова гэта зрабіць мне складана, бо маю невялікую пенсію. Ці магчыма аплаціць гэту рэгістрацыю ў растэрміноўку за 3 ці 4 месяцы або неяк па-іншаму?***

**Міхаіл Іванавіч,** *п. Любча, Навагрудскі раён.*

— Па пытанні аплаты паслуг Міхаіл Іванавіч можа паспрабаваць дамовіцца непасрэдна з тэрытарыяльным агенцтвам па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Аднак звычайна прадпрыемствы па рэгістрацыі аб'ектаў нерухомасці патрабуюць спачатку перадаплату сваіх паслуг.

***☎ — У 1985 годзе памерлі мае дзед і бабка. Пасля іх застаўся дом і гаспадарчыя пабудовы. У 1987 годзе дом і пабудовы былі атрыманыя ў спадчыну і падзелены дзецьмі на 5 частак. Цяпер я валодаю дзвюма пятымі часткамі спадчыны. Сёння і астатнія 3 часткі спадчыны мае сваякі гатовыя перааформіць на маё імя, але... Застаецца нявырашаным пытанне зямлі, якую мне прапануюць аформіць у арэнду, бо сваякі зараз жывуць у Расіі.***

**Уладзіслава Слізкая,** *Магілёўскі раён, вёска Сялец.*

— Зямлю не трэба афармляць у арэнду. Сёння вашы сваякі маюць права атрымаць зямлю ў спадчыну на тым праве, на якім яна была раней. Тады зямля не была на іх аформлена?

***— Не.***

— Потым афармляйце ўсё цалкам. Дастаткова звярнуцца да натарыуса па новае пасведчанне. Пасля гэтага вашы сваякі могуць падарыць ці яшчэ нейкім чынам перадаць вам усю гэту маёмасць. Калі будуць нейкія складанасці пры вырашэнні гэтага пытання, то тэлефануйце непасрэдна мне ў прыёмную Дзяржкамітэта па маёмасці Беларусі. Пытанні чытачоў «Звязды» па «прамой лініі» мы заўсёды паспяхова вырашалі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Працяг будзе.)*

# БУДЗЕ ГЕРБ У ВОБЛАСЦІ

**На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў народныя выбраннікі ўхвалілі праекты герба і сцяга Прыдзвінскага краю.**

— Адназначна, герб і сцяг — цывілізаваныя атрыбуты, якія ў ліку іншага будуць спрыяць і развіццю турызму, — расказвае «Звяздзе» намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Іосіф Палачанін. — Гэтую сімволіку пасля афіцыйнага зацвярджэння трэба актыўна выкарыстоўваць пры стварэнні прадукцыі, што рэкламуе вобласць. Ды і жыхары Прыдзвінскага краю, дзякуючы атрыбутыцы, змогуць лепш ведаць гісторыю роднай зямлі.

Рабочую групу, якая займалася распрацоўкай герба, узначальваў старшыня абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў.

— Віцебская вобласць — адзіны рэгіён Беларусі, дзе не было ўласнага герба. Пры гэтым амаль усе райцэнтры і нават такі малы горад, напрыклад, як Дзісна, а таксама пасёлкі Сураж, Янавічы і іншыя населеныя пункты маюць афіцыйныя геральдычныя сімвалы, — адзначае Аляксандр Ацясаў. — Прымаючы за аснову гістарычны герб, мы аддаём даніну павагі ўсім воінам, што абаранялі гэтую зямлю.

Дарэчы, разглядаліся два варыянты сімволікі — геральдычны знак Віцебскага ваяводства ўзору 1500 года і герб Віцебскай губерні 1856 года. Жыхары вобласці актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні. Яны таксама маглі выбраць варыянт, які лепш адлюстроўвае багатую на падзеі гісторыю рэгіёна. У прыватнасці, у папулярную дзяржаўную абласную газету «Народнае слова» чытачы не толькі тэлефанавалі і пісалі на гэтую тэму, але і дасылалі ўласныя варыянты.

У выніку карпатлівай работы па стварэнні варыянтаў герба і абмеркавання, як гаворыцца, прыйшлі да кансенсусу. Дэпутаты вырашылі зацвердзіць у якасці праекта герба геральдычны знак 1856 года.

Герб уяўляе сабой наступнае: у чырвоным полі французскага шчыта выява срэбнага ўзброенага конніка, у правай руцэ якога падняты срэбны меч, у левай — круглы шчыт з залатым шасціканцовым Ефрасіннеўскім крыжам. Шчыт абрамляюць дзве залатыя дубовыя галіны з жалудамі, перавітыя блакітнай стужкай. Герб вянчае вежавая карона з пяццю зубцамі. Такім чынам, да гістарычнага герба дадалі толькі Ефрасіннеўскі крыж.

Сцяг вобласці — прамавугольнае палотнішча зялёнага колеру (як мяркуюць спецыялісты, менавіта такія харугвы былі ў старажытнага княства) з суадносінамі бакоў 1:2, а ў цэнтры — выява герба.

Пасля таго, як праекты герба і сцяга пройдуць экспертызу ў Геральдычным савеце пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, яны будуць зацверджаны Указам кіраўніка дзяржавы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Матор... Знята... Глядзім!

# Хто не хоча стаць мільянерам?

**У апошнія дні лютага наведвальнікам нашых кінатэатраў будуць паказаны чарговыя тры шматабяцальныя кінапрэм'еры, створаныя кінамайстрамі ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі. Сярод іх, што прыемна, ужо і намінанты на «Оскар».**

Асаблівай увагі заслугоўвае фільм **«Мільянер з трушчобаў»**. На цырымоніі ўручэння ўзнагарод прэміі «Оскар» карціна была прызнаная лепшым фільмам года. Акрамя таго, яна атрымала яшчэ сем узнагарод, у тым ліку і за лепшую рэжысуру (Дэні Бойл). У выйгрышны сюжэт фільма свежасць, праўдзівасць і шчырасць данеслі акцёры-дэбютанты (Дэў Патэль, Фрэйда Пінта, Аніл Капур, Ірфан Хан і іншыя).

Фільм зняты па рамане вядомага індыйскага пісьменніка В. Сварупа і распавядае гісторыю васямнаццацігадовага сірaты з трушчобаў Мумбаі, які дайшоў да апошняга этапа індыйскага аналага тэлегульні «Хто хоча стаць мільянерам?». Эфірны час заканчваецца, і яго арыштоўваюць паліцыя па падазрэнні ў махлярстве. Адкуль юнак, які вырас на вуліцы, можа столькі ведаць? На допыце высвятляецца, што кожнае пытанне гульні адпавядала вызначанай падзеі ў яго цяжкім жыцці, у якім былі і сутычкі з мясцовымі бандамі, і трагічнае каханне, і прыгоды, перажытыя разам з братам. Тэлегульню працягнуць і застанецца высветліць толькі адно пытанне: навошта юнаку без відавочнага імкнення да багацця прымаць удзел у гэтай праграме?

Фантастычны фільм **«Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана»**, зняты вядомым амерыканскім рэжысёрам Дэвідам Фінчэрам, стаў лідарам па колькасці намінацый на чарговага «Оскара», але атрымаў толькі тры ўзнагароды.

Гэтая гісторыя пра маркотнае і кранальнае каханне, аб наканаванні лёсу, нястрыманасці часу. Галоўны герой кінастужкі Бенджамін (Брэд Піт) з гадамі не старэе, а становіцца ўсё маладзейшым. У пяцідзесяцігадовым узросце ён сустракае сваё каханне. Ёй (Кейт Бланшэт) трыццаць. Але як змогуць працягнуцца іх адносіны, калі мужчына пачынае рэзка маладзець?..

Фільм **«Інтэрнэшнл»** — вынік сумеснай працы кінамайстроў ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі. Рэжысёр карціны Том Тыквел («Бяжы, Лола, бяжы», «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы») распавядае гісторыю крушэння фінансавай імперыі свету. Спосабы хуткага абагачэння вядомыя: гандаль зброяй, наркотыкамі, фінансаванне тэрарыстаў. У барацьбу з усемагутным банкірам, праз якога «адмываюцца» грошы, уступае рашуча настроены агент Інтэрпала. Але хутка ён сам становіцца аб'ектам пераследу сваіх жа калегаў, сутыкнуўшыся ў выніку расследавання з наскрозь карумпаванай праваахоўнай сістэмай.

Ролі выконваюць: Клайв Оўэн, Наомі Уотс, Армін Мюлер-Шталь. Прыемнага прагляду!

**Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.**

## Невядомыя абаронцы Айчыны

**23 лютага ў Магілёве з шанаваннямі пахавалі парэшткі двух салдат, якія загінулі пры абароне горада ў 1941 годзе.**

Парэшткі знайшлі ўлетку падчас земляных і будаўнічых работ. Адны — у раскопках пры ліквідацыі старых пабудоў вайсковай часткі, другія — пры працы экскаватара на будаўніцтве новага шматкватэрнага дома.

— Там былі косці і фрагменты амуніцыі, — расказаў старшыня пошукавага клуба «Віккру» Мікалай Барысенка. — Каска, манеты, процівагаз, асабістыя рэчы — тыповы набор вайскоўца 1941 года. Парэшткі знайшлі там, дзе праходзіла лінія абароны Магілёва.

На жаль, абодва салдаты застаюцца невядомымі. Іх пахавалі ў капліцы мемарыяльнага комплексу «Буйніцкае поле». У капліцы цяпер спачываюць дзесяць абаронцаў Магілёва, прычым вядомыя прозвішчы толькі трох з іх. Мяркуецца, што пры гераічнай абароне горада загінула больш за 25 тысяч вайскоўцаў. Сёння вядомых пайменна толькі крыху болей за 1,5 тысячы. На Буйніцкім полі прайшоў мітынг. Кіраўнікі Магілёўшчыны і прадстаўнікі грамадскасці ўсклалі вянкі і кветкі да мемарыяльнай капліцы.

**Ілона ІВАНОВА.**

Мова — душа народа

# ЯК ЧУЕЦЦА, ТАК І ПІШАЦЦА?

**Сапраўднасць школьнага выказвання правярала карэспандэнт «Звязды» на агульнанацыянальнай дыктоўцы.**

На першы погляд, ініцыятыва Таварыства беларускай мовы — агульнанацыянальная дыктоўка — падаецца дзіцячай забавай. Вось выдумалі дыктоўкі пісаць! Для чаго і навошта? Тым болей, што і складанасцяў пры напісанні не павінна ўзнікнуць ніякіх, «як чуецца, так і пішацца»...

На сядзібе Таварыства беларускай мовы народу няшмат. На першую дыктоўку ў 11.00 у невялічкім памяшканні сабралося каля 15 чалавек, палова з якіх — журналісты, а таксама тры хлопцы-ліцэісты, выкладчыца ўніверсітэта, дзяўчынка-школьніца і інш. Крыху прыпазніўся пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан. Спадар Стэфан папрасіў прабачэння. «Пасля ўрокаў будзеце пісаць», — пажартавалі прысутныя.

Дыктоўка «Родная мова» паводле Уладзіміра Караткевіча. Тэкст, па словах намесніка старшыні Таварыства беларускай мовы Алены Анісім, няцяжкі, «мова сучасная», знакі прыпынку не звышскладаныя.

«Родная мова, мова Скарыны і Буднага...», — зарыпелі ручкі па паперы, пачалася дыктоўка. Побач са Стэфанам Эрыксанам, які пісаў звычайным алоўкам, ляжала гумка: калі нешта атрымлівалася не так, спадар Стэфан хуценька сціраў памылку.

У пэўных момантах былі цяжкасці, напрыклад, як напісаць: «не цяжкая» ці «няцяжкая», «баскі» ці «баскскі»... Высвятляецца, што досыць складана праз тры гады пасля школы зноў пісаць дыктоўкі. Доўга даводзілася думаць і над знакамі прыпынку... Тэкст быў досыць эмацыянальным, таму і прыпынкаў аўтар не шкадаваў. Асабліва тых, якія правілам не падпарадкоўваюцца.

Дыктоўка заняла каля 30 хвілін. Апошняя кропка. Словы падзякі і пажаданні паспехаў.

Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

Праверыць правільнасць напісання можна на сайце ТБМ, дзе размешчаны тэкст. У мяне было чатыры памылкі: «валійская», як высветлілася, пішацца з дзвюма літарамі «л»; правільна ўсё ж «баскскі»; замест аўтарскіх працяжнікаў наставіла двукроп'яў... Вось вам і прынцып «як чуецца, так і пішацца».

— Ведаеце, сярод тых дыктовак, якія мы мелі, якія нам дасылалі з рэгіёнаў, памылак няшмат, — кажа Алена Анісім. — Пераважна гэта няправільная расстано

1

# ГАЛАНДСКІЯ ТЭХНАЛОГІІ ПЛЮС БЕЛАРУСКАЯ ПРАЦАВІТАСЦЬ

**Для даведкі.** Агракамбінат «Ждановічы» (размешчаны побач з Мінскам, адразу за кальцавой дарогай) уяўляе сабой буйнагаліновую гаспадарку, у якой займаюцца практычна ўсімі відамі сельскагаспадарчай дзейнасці — вытворчасцю малака і мяса, вырошчваннем збожжа, піваварнага ячменю, цукровых буракоў, рапсу, кукурузы, бульбы, а таксама гароднінных культур, прычым як у адкрытым грунце, так і ў закрытым, або ў цяпліцах. Аднак, безумоўна, агракамбінат «Ждановічы» больш за ўсё вядомы, і ў першую чаргу пакупнікам сталічнага рэгіёна, сваімі цяплічнымі агуркамі і памідорамі. Тут маюць адну з самых буйных у рэспубліцы цяплічных гаспадарак, прычым, цалкам заснаваную на прымяненні перадавой галандскай тэхналогіі, здымаюць самы вялікі ў краіне ўраджай гэтых культур.

Ждановіцкія агуркі і памідоры, і перш за ўсё памідоры, пастаянна карыстаюцца добрай славай у пакупнікоў, заўсёды маюць у іх устойлівы попыт. Развіваючы сваю цяплічную гаспадарку далей, на агракамбінаце ўвялі напрыканцы 2006 года (у вёсцы Багатырова) новыя, больш сучасныя цяпліцы, размешчаныя на плошчы 7 гектараў, уводзяць побач яшчэ адзін такі ж цяплічны комплекс.

Тэрыторыя сельскагаспадарчых угоддзяў агракамбіната складае больш за 11 тысяч гектараў, з іх больш за 9 тысяч гектараў — ворная зямля. У агракамбінаце 10 жывёлагадоўчых фермаў, на якіх налічваецца больш за 6 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 2200 галоў дойнага статку.

Высокія магчымасці агракамбіната ў вырошчванні прадукцыі як раслінаводства, так і жывёлагадоўлі падмацоўваюцца яго добрай тэхнічнай аснашчанасцю. У склад яго машынна-трактарнага парка ўваходзяць больш за 200 адзінак тэхнікі, у тым ліку замежныя высокапрадукцыйныя кормаўборачныя комплексы «Ягуар», збожжаўборачныя камбайны «Клаас» і «Лексіён».

У 2003 і 2005 гадах да агракамбіната былі далучаны раней адсталыя гаспадаркі калгас імя Калініна і саўгас імя Фрунзе, якія знаходзіліся, адпаведна, у Мінскім і Дзяржынскім раёнах, пры гэтым межавалі з землямі камбіната. Такім чынам, добрая аграэкспансія агракамбіната «Ждановічы» распаўсюдзілася і на суседні раён, прычым вытворчасць у далучаных гаспадарках ужо ў хуткім часе была выведзена на сучасны ўзровень.

У мінулым годзе ў «Ждановічах» атрымалі 11 026 тон агародніны з закрытага грунту, 6337 тон — з адкрытага, намалацілі (у бункернай вазе) 39 707 тон збожжа (34 506 тон — у амбарнай вазе), пры гэтым ураджайнасць збожжавых склала ў бункернай вазе 68,9 цэнтнера з гектара, у амбарнай — 59,9.

За мінулы год у гаспадарцы надаілі 14 153 тоны малака, якое ў значнай колькасці ідзе на дзіцячае харчаванне; сярэдні надой ад адной каровы склаў 6430 кілаграмаў.

Сёлета працаўнікі прадпрыемства будуць адзначаць 50-годдзе з дня яго стварэння.

Ужо шмат гадоў кіруе агракамбінатам Рыгор Пятровіч Чуйко. Не так даўно ён стаў членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.



2

Цяплічная прадукцыя — адна з асноўных у агракамбінаце «Ждановічы». Так, у мінулым годзе тут атрымалі яе больш за 11 тысяч тон, яна прынесла гаспадарцы і асноўную частку прыбытку. Прычым у мінулым годзе, акрамя традыцыйных агуркоў і памідораў, у «Ждановічах» сталі спрабаваць вырошчваць таксама баклажаны і перцы, а яшчэ гронкападобныя памідоры «чэры». Мінулагодні вопыт вырашылі паўтарыць і сёлета. Каб лепш уявіць той гароднінны вал цяплічнай прадукцыі, які маюць у «Ждановічах», прыкінем: гэтай прадукцыі ў сярэднім вырошчваецца тут за год больш чым па 5 кілаграмаў на кожнага мінчаніна. На кожнага, без выключэння. Зрэшты, ждановіцкія памідоры добра вядомыя не толькі пакупнікам сталічнага рэгіёна, але і іншых рэгіёнаў рэспублікі.

Цяплічныя агуркі і памідоры ў «Ждановічах», яшчэ раз падкрэслім, — гэта асноўны прадукт. Але далёка не адзіны. Тут таксама садзяць агародніну (моркву, капусту, буракі, цыбулю) у адкрыты грунт, вырошчваюць бульбу, збожжа і іншыя культуры, маюць таксама «вялікае» малако (больш за 14 тысяч тон атрымалі за мінулы год), неблагое мяса... Гэта колькі ж жыхароў сталіцы ўзялі тут, па сутнасці, на поўнае забеспячэнне?

А яшчэ ўжо ў хуткім часе (пра што мы даведаліся падчас гутаркі з галоўным эканамістам Жаннай Фёдараўнай Мончык) мінчане будуць мець і ждановіцкую садавіну — з вялізнага саду агракамбіната, які ўжо закладзены і працягвае займаць тут новыя плошчы. Сад ужо разбіты на плошчы 59 га, а ўсяго мяркуецца заняць ім 200 га. Пры гэтым у гаспадарцы для змяншэння кошту ўсяго працэсу арганізавалі і вырошчванне саджанцаў — у сваім жа пітомніку. За гэту справу, як добра відаць, у «Ждановічах» таксама ўзяліся з уласцівым для працаўнікоў агракамбіната размахам. Аднак, атрымліваецца, для іх і той жа крызіс, якім нас цяпер даволі часта палохаюць, не крызіс? Як таксама не палохае зробленае нядаўна ў краіне зніжэнне на 10 працэнтаў закупачных цэнаў на мяса і малако, што таксама, няйначай, з'явілася не лепшым сюрпрызам для сельгасвытворцаў?.. У прыватнасці, такія пытанні і былі заданы Жанне Фёдараўне, гутарку з якой мы прапануем нашым чытачам.

— Мы сваёй прадукцыяй з «абароненага» грунту забяспечваем выключна ўнутраны рынак, таму і гэтыя сусветныя ўзрушэнні нас пакуль што не закранулі, — сказала яна. — Аднак, вядома, трэба быць гатовымі да любых нечаканасцяў. Наша галоўная задача — вырабіць прадукцыю, і нашы працаўнікі няблага гэта ўмеюць. Разам з тым, безумоўна, у сённяшніх умовах трэба пастаянна трымаць пад увагай пытанні яе рэалізацыі, тым больш, што мы можам гаварыць і наконт даволі моцнай канкурэнцыі на рынку. Адпаведна, яшчэ адна з нашых галоўных задач датычыць расшырэння кола нашых гандлёвых партнёраў, кола нашых гандлёвых сувязяў; нам неабходна выходзіць на новыя гандлёвыя сувязі. Мы пры гэтым імкнёмся максімальна прадаць сваю прадукцыю праз аптовы гандаль. Разам з тым не адмаўляемся і ад рознічнага гандлю.

Што датычыць зніжэння закупачных цэнаў на мясамалочную прадукцыю, думаю, кампенсуем гэта за кошт правядзення пэўных, ужо намечаных у нас мерапрыемстваў. Тым больш, гэтыя мерапрыемствы ўжо і без гэтага наспелі — у адрозненне ад раслінаводства, вынікі ў жывёлагадоўлі нас не вельмі радуюць. Словам, мы хацелі б бачыць лепшымі тыя «натуральныя» паказчыкі, якія дасягнуты ў жывёлагадоўлі за мінулы год і якія адпаведным чынам паўплывалі на нашы агульныя фінансавыя паказчыкі. Адна з нашых асноўных задач у жывёлагадоўлі, якую намечана вырашыць у найбліжэйшы час, — наладжванне ў гаспадарцы вытворчасці ўласных камбікармоў для жывёлы. Яны ў выніку будуць для нас намнога таннейшымі, а значыць — намнога зменшацца і нашы адпаведныя выдаткі.

***— Жанна Фёдараўна, што, акрамя, вядома, пэўных дасягненняў у вашай непасрэднай сельскагаспадарчай справе і, у прыватнасці, у цяплічнай гаспадарцы, вы яшчэ б аднеслі на асобны рахунак мінулага года?***

— У мінулым годзе зроблена маштабная рэканструкцыя нашага цэха для доўгатэрміновага захоўвання агароднінай прадукцыі з адкрытага грунту. Раней у нас была старая пабудова з даволі прымітыўнымі спосабамі такога захоўвання, а цяпер гэта практычна зусім новы цэх з халадзільным абсталяваннем і, адпаведна, новымі магчымасцямі. І ён ужо ў мінулым годзе быў запоўнены прадукцыяй ураджаю мінулага ж года. Гэта рэканструкцыя каштавала для нас больш за 3 мільярды рублёў. Набывалася таксама новая сельскагаспадарчая тэхніка, прычым з улікам не толькі яе высокай прадукцыйнасці, таго, каб вытрымаць на ёй сучасную тэхналогію, але і з улікам яе зручнасці, камфортнасці для тых, хто потым на гэту тэхніку садзіцца; словам, адначасова трэба думаць і пра людзей... Цяпер у нас робіцца праект новай малочна-таварнай фермы. Гэта павінна быць найсучаснае вытворчасць з робатамі для даення. Праўда, гэта патрабуе немалых сродкаў, якіх нам на сённяшні дзень не хапае...

3

***— Звернемся да вашай цяплічнай гаспадаркі. Вырошчванне цяплічнай прадукцыі з'яўляецца даволі затратнай справай, асабліва калі мець на ўвазе кошт энергарэсурсаў, які пастаянна расце. Асобныя вытворцы па гэтай прычыне маюць нават адмоўную рэнтабельнасць...***

— Рэнтабельнасць нашых цяпліц за мінулы год — плюс 39,5 працэнта. За кошт чаго такая добрая? У першую чаргу за кошт высокай аддачы кожнага квадратнага метра цяпліц. (Варта нагадаць: нават у старых цяпліцах у «Ждановічах» атрымалі ў мінулым годзе з квадратнага метра каля 60 кілаграмаў памідораў і каля 70 — агуркоў. А яшчэ колькі гадоў таму тут лічылі неблагім дасягненнем 40-кілаграмовыя ўраджаі.) Дык, безумоўна, дзякуючы таму, што агракамбінат, маючы на ўвазе сваю цяплічную гаспадарку, не спыняўся і не спыняецца ў яе мадэрнізацыі, далейшым развіцці. Так, сапраўды, у структуры выдаткаў цяплічнай гаспадаркі энергарэсурсы займаюць ільвіную долю. Але ж на прадпрыемстве далёка не сёння пачалі думаць над тым, як скараціць гэтыя выдаткі, а яшчэ тады, калі цэны на энганосьбіты былі даволі зручныя для ўсіх.

Над скарачэннем энергазатрат у нас пачалі думаць яшчэ ў 1994 годзе. Вельмі добрыя вынікі ў гэтым плане прынесла рэканструкцыя кацельні, раздзяленне контуру цяпла, забеспячэнне большай падачы ў цяпліцы $CO_2$. Усё гэта, вядома, каштавала грошай, але мы ў выніку істотна знізілі расход энергарэсурсаў з разліку на адзінку атрыманай прадукцыі.

Цяпер звернемся да нашых новых цяплічных комплексаў у вёсцы Багатырова, адзін з якіх ужо дзейнічае. Тут плануецца ўвесці так званую газапаршневую ўстаноўку, якая будзе забяспечваць нашы цяпліцы як цяплом, вуглякіслым газам, так і электраэнергіяй. Прычым апошняя, паводле разлікаў, будзе для нас у 3 разы таннейшая, чым пакупная. У такім выпадку можна наладзіць у нашых новых цяпліцах з дапамогай электралямпаў дадатковае асвятленне, і прадукцыя пры гэтым, нават пры павышаным расходаванні электраэнергіі, застанецца канкурэнтаздольнай. А тыя ж памідоры і агуркі можна будзе ў выніку вырошчваць круглы год.

***— І яшчэ такое пытанне: вышэй вы сказалі «трэба думаць і пра людзей» — чым яшчэ ў гаспадарцы могуць пацвердзіць гэту вельмі добрую ўстаноўку?***

— Адразу ж удакладню гэта пытанне: мы ніколі не забываем і не павінны забываць, што знаходзімся побач з Мінскам, які заўсёды прывабліве да сябе працоўныя кадры. А мы павінны замацаваць добрыя кадры менавіта ў сябе. Адпаведна, у нас неблагая заработная плата — так, за мінулы год яна склала ў сярэднім больш за адзін мільён рублёў. На базе прадпрыемства ў мінулым годзе ўзведзены дом моладзевага ЖБК, арганізаваны ЖБК у Азярцы (гэта непадалёк ад аўтамабільнага рынку), пабудаваны і будуюцца дамкі па прэзідэнцкай праграме. Прычым у далейшым, з тым, каб зрабіць гэта будаўніцтва больш танным, плануем будаваць так званым гаспадарчым спосабам, які быў добра вядомы ў савецкі час. Для гэтага атрымалі адпаведную ліцэнзію, папаўняем сваю будаўнічую брыгаду. У агракамбіната ёсць свае інтэрнаты, на ўтрыманне якіх выдаткоўваем да мільярда рублёў за год. Працаўнікі агракамбіната маюць увесь ранейшы сацыяльны пакет — тут і рознага кшталту матэрыяльная дапамога, і клопат пра пенсіянераў і г.д. Нашы людзі рэгулярна падвозяцца да месца іх працы — для гэтага спецыяльна купілі аўтобусы...

Зразумела, усё гэта патрабуе пэўных выдаткаў, і, вядома ж, на ўсё гэта трэба спачатку зарабіць. Пакуль што зарабляем, хоць часам і не абыходзіцца без тых ці іншых праблем...

Гэта, нагадаем, была гутарка з галоўным эканамістам агракамбіната «Ждановічы» Жаннай Фёдараўнай Мончык. Прычым тут жа пракаментуем яе апошнюю фразу. У агракамбінаце планавалася атрымаць ад кожнай з 2200 кароў дойнага статка па 6800 кілаграмаў малака, а атрымалі па 6430. І вельмі не задаволены гэтым вынікам. Такая вось адна з праблем. Аднак мець бы нашым многім іншым гаспадаркам падобны вынік. Што ж, як кажуць, у кожнага свае праблемы... Праўда, для агракамбіната вельмі актуальнай задачай з'яўляецца дасягненне належнай даходнасці ў жывёлагадоўлі. Зрэшты, тут гэта добра разумеюць і заклапочаны пошукам адпаведных шляхоў.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

4

**На здымках:**

1. Начальнік цэха Аляксандр ВАШКОЎ.
2. Зялёны цэх пад шклом працуе ва ўсе часы года;

гэтыя мініяцюрныя памідоры гатунку «чэры» таксама вырошчваюць на плантацыях пад шклом. Хоць яны вырастаюць памерам з буйную вішню, іх высока ацэньваюць знаўцы кулінарыі;

гароднінаводы Святлана КАСЦЯНКОВА і Таццяна ЗІЗІКА на ўчастку, дзе падрастае чырвоны перац;

майстар Валянціна ШЧАМЯЛЁВА пазнаёміла нас з сістэмай магутных помпаў, якія дзейнічаюць у цяпліцах.

3. Кацярына ХРАНОВІЧ працуе ў цяпліцах інжынерам-энергетыкам.
4. Аператару тэхпрацэсаў Мікалаю ДУДАРЧЫКУ даручана сачыць за станам клімату, асвятленнем і палівам на плантацыях;

аграном Таццяна ДЗЕРУЖКОВА задаволена ростам агуркоў;

цяплічніца Тамара ШЫШКО манцыруе падвескі, па якіх кусты памідораў цягнуцца ўвышыню.

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 600049705

# Вясковы турызм павінен грунтавацца на моцнай нацыянальнай ідэі

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Зараз мы ад Нацыянальнага агенцтва па турызме атрымалі праграму пазнавальнай экскурсіі «Краіна замкаў». Туды ўключана Ліда і наведванне вёскі Дакудава, дзе турысты знаёмяцца з трыма аграсядзібамі. Увогуле, там ужо сем сядзіб.

***— Што сёння ўяўляе сабой беларуская аратурыстычная сядзіба і як яна развіваецца?***

— Сядзібы адрозніваюцца па сваёй спецыялізацыі і памерах. Шлях развіцця вызначаецца, у першую чаргу, памерам сядзібы. Ёсць дастаткова камерныя, якія не жадаюць пашырацца. Сядзібы тыпу «буцік» прапануюць эксклюзіўны сэрвіс, яны працуюць, што называецца, са штучным таварам. Напрыклад, сядзіба «Над Нёманам» у Лідскім раёне, там адпачываў прэм'ер-міністр і літоўскія сенатары. Гаспадары такой сядзібы не жадаюць прымаць больш за 7-9 чалавек, каб захаваць высокую якасць абслугоўвання.

Другі тып больш дэмакратычны. Кошты там ніжэйшыя, адпачынак не прэтэндуе на элітарнасць, затое гаспадаркі больш натуральныя. Юра і Света Агаркі — гаспадары такой сядзібы ў вёсцы Дакудава ў тым жа Лідскім раёне. Дарэчы, іх вельмі палюбілі немцы, рэгулярна туды прыязджаюць. Там ёсць дзеці, жывёлы, вельмі прыемная атмасфера, зялёныя маршруты. Гэта таксама невялікая сядзіба, і яе гаспадары не збіраюцца значна пашыраць. Аднак паслугі Юры як правадніка маршрутаў хутка могуць стацца запатрабаванымі для іншых гаспадароў. Я думаю, што ў зонах, падобных Дакудаву, з'яўляцца лідары, якія будуць арганізоўваць вольны час для турыстаў з некалькіх сядзібаў.

Трэці тып арыентаваны на карпаратыўнае навучанне, семінары і святы. Тут размова ідзе пра тое, каб размясціць чалавек 20-50. Такія ўжо падыходзяць да той мяжы, калі патрабуецца наёмны персанал і дадатковыя плошчы. Такія перарастуць у прыватныя, індывідуальныя прадпрыемствы альбо таварыствы. У нас пад Бабруйскам ёсць аграсядзіба «У дзядзькі Фёдара», гаспадар якой хоча стварыць спа-курорт, для гэтага яму трэба 38 наёмных работнікаў. Але тады ён павінен будзе зарэгістраваць сябе ўжо як прадпрымальнік.

Ёсць у нас яшчэ сядзібы, якія маюць спартыўна-турыстычную накіраванасць: «Кролава хата», «Рачная»... Сама сядзіба з'яўляецца базай, адкуль групы выпраўляюцца ў паходы на некалькі дзён і куды потым вяртаюцца. У нас ёсць гастранамічныя сядзібы. І ёсць яшчэ этнаграфічныя, такія як «Прыазёрная» Вольгі Маханенкі ў Старым Лепелі. Туды можна паехаць, каб паглядзець народныя абрады і гульні.

Акрамя таго, ёсць тры зусім іншыя мадэлі. Гэта аграсядзібы на базе СВК, этнаграфічныя музеі і Нацыянальныя паркі. Гэта ўсё — адна тэма, толькі розныя варыянты. І кожны па-свойму цікавы. Галоўнае, каб аграгурызм быў змястоўным і меў моцную нацыянальную ідэю.

***— У складзе журы конкурсу «Лепшая сядзіба года» вы пабачылі каля трох дзясяткаў сядзібаў. Як у іх складваецца сітуацыя з нацыянальнай ідэяй?***

— Я вельмі люблю жарт аднаго старшыні калгаса: «Вы ведаеце, мы не ў балеце!» Гэта значыць, што ў нас няма строгіх стандартаў: аўтэнтычная сядзіба, ад яе і танцуем. Не. Людзі пачынаюць з таго, што ў іх ёсць. Яны маюць той дом, які калісьці пабудавалі альбо набылі. Вельмі часта гэта дамы з сілікатнай цэглы, якую я, напрыклад, увогуле не пераношу. Альбо драўляныя дамы, абкладзеныя цэглай — таксама мне не падабаецца, але дазваляе паменшыць страту цяпла. Вельмі шмат будынкаў, якія, вядома, не адпавядаюць нацыянальным традыцыям. Але любую сядзібу можна адаптаваць пад аграгурызм і нацыянальную беларускую ідэю правесці ва ўсім: пачынаючы ад ежы, аповедаў і заканчваючы элементамі інтэр'еру. Не кажучы ўжо пра экскурсійныя праграмы.

Я бачыла, што адбываецца ў Латвіі. Там Еўрасаюз вельмі падтрымлівае ідэю аграгурызму, бо гэта — новыя працоўныя месцы. Латышы бяруць мільённыя доларавыя крэдыты, палова з якіх незваротныя, пры ўмове, што ты створыш аб'ект аграгурызму і працуеш у ім 5 гадоў. І вось тыя новыя аб'екты, якія яны ствараюць, адпавядаюць нацыянальным традыцыям і спалучаюць дасягненні цывілізацыі. Гэта драўляныя будынкі, дах якіх пакрыты дранкай, але ўнутры — самая сучасная сантэхніка, інтэрнэт і сотавая сувязь.

Калісьці, магчыма, і мы выйдзем на такі ўзровень. Сёння Белаграпрамбанк дапамагае палепшыць умовы ў тых будынках, якія ёсць, і гэта ўжо добра. Пакуль мы можам толькі імкнуцца прабудзіць у людзях цікавасць да нацыянальнай ідэі. Дапамагчы ім зразумець: турыст павінен адчуваць, што ён знаходзіцца ў беларускай вёсцы.

Думаю, не варта цалкам адмаўляцца і ад спадчыны савецкіх часоў. Бо гэта таксама цікава, экзотыка для іншаземцаў, і самае галоўнае, гэта для нас — натуральна, гэта ўвайшло ў нашу кроў, зрабіла нас не падобнымі на іншых. Таму я думаю, што нацыянальная ідэя — гэта не толькі народныя рамёствы, фальклор і дойлідства. Гэта яшчэ і тыя 70 гадоў жыцця ў сацыялістычнай краіне, якія пакінулі адбітак у нашым менталітэце.

Два апошнія гады па Беларусі праходзіць міжнародны велатур, у рамках якога нашу краіну наведваюць некалькі дзясяткаў іншаземцаў. Яны спыняюцца ў беларускіх вёсках і потым кажуць пра тое, што сустрэчы на гэтай зямлі перавярнулі іх жыццё: яны нідзе больш не бачылі такой блізкасці і цеплыні чалавечых зносін, як у нас. Так што гэта — таксама нацыянальная ідэя. І вельмі хочацца, каб яна захавалася, каб імкненне зарабіць грошы не знішчыла сусветны рарытэт, якім мы валодаем, — душэўнасць стасункаў.

* * *

*Віктар ЯНКАВЕНКА, дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:*

## АГРАТУРЫЗМ — НЕ ТОЛЬКІ ПРЫВАТНЫЯ СЯДЗІБЫ

— Аграэкатурызм — гэта від турызму, які сёння найбольш дынамічна развіваецца. У 2006 годзе для яго былі створаны надзвычай льготныя ўмовы. Гаспадару сядзібы дастаткова жыць у сельскай мясцовасці альбо ў невялікім горадзе з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек (дапаўненне наконт апошняй акалічнасці было ўнесена ў заканадаўства ў 2008 годзе), яму не трэба рэгістраваць сябе ў якасці юрыдычнай асобы, ён мае мінімальную падатковую нагрузку — адну базавую велічыню ў год (35 тыс. беларускіх рублёў), спрошчаны парадак справаводства і заняўны прынцып рэгістрацыі. З канца 2007 года для тых, хто трапляе ў Нацыянальную праграму развіцця турызму, спрошчана працэдура выдзялення зямельных участкаў.

Я лічу, што за ўсе гады існавання турызму ў нашай краіне Указ Прэзідэнта № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь» атрымаўся найбольш удалым. Таму летась, згодна з афіцыйнымі звесткамі, у вясковых сядзібах адпачыла 39 тысяч турыстаў, з іх 1 800 — замежных.

Аднак адпачынак у вясковых сядзібах — толькі адзін з відаў аграэкатурызму. Мы не павінны забываць пра тое, што ў нас сёння створаны 16 турыстычных комплексаў на базе СВК. Да канца 2010 года іх павінна адкрыцца 118. Гэта цэлыя рэкрэацыйныя цэнтры і вельмі выгадны від дзейнасці для саміх СВК, бо дазваляе зарабіць «жывую» капейку ў міжсезонне.

Другі від «зялёнага» турызму — нашы Нацыянальныя паркі. Да кожнага з гэтых трох відаў аграэкатурызму свой падыход. Мінімальныя патрабаванні да ўладальнікаў сядзібаў. Сёння чатыры прафесійна-тэхнічныя вучылішчы ў нас рыхтуюць спецыялістаў для гэтага роду дзейнасці. Адна са спецыяльнасцяў Гарадоцкага агракаледжа ў Віцебскай вобласці так і называецца: «гаспадыня аграсядзібы».

Адна з галоўных мэтаў 372-га Указа была стварыць дадатковыя працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці. І гэта таксама атрымалася.

Указам дадзены льготы для гаспадароў сядзібаў да канца 2010 года. Праўда, дакумент прадугледжвае магчымасць працягу гэтага тэрміну. Сёння мы прадумваем, якое павінна быць заканадаўства ў гэтай галіне з 2011 года.

*Святлана КОНЧЫЦ, начальнік Упраўлення карпаратыўнага бізнэсу ТАА «Белаграпрамбанк», член журы конкурсу «Лепшая сядзіба года»:*

## «ТАМ БОЛЬШ АДЧУВАЕШ СЯБЕ ЧАЛАВЕКАМ»

— Мне вельмі спадабаліся сядзібы, якія мы пабачылі падчас правядзення конкурсу. Банкаўская дзейнасць — гэта лічбы, прыняцце рашэння, пралічванне фінансавай рызыкі. Калі пасля працоўнага тыдня едзеш на аграсядзібу, хай сабе і не адпачываць, а ў якасці члена аргкамітэта конкурсу, то атрымліваеш каласальны эмацыйны зарад і аддушыну, станоўчую энергію. Дзякуючы гаспадарам гэтых вясковых мініг-гасцініц, больш адчуеш сябе чалавекам. Я не сумняваюся, што ў аграгурызму ёсць будучыня.

Гэта цікава не толькі мне асабіста, але і банку. Бо гэта, у першую чаргу, цікава нашай краіне, яе людзям, яе гасцям. Банк ганарыцца тым, што мае дачыненне да станоўчых эмоцый, якія прыносіць аграгурызм, што яго фінансавыя сродкі дапамагаюць адраджаць традыцыі і прывіваць моладзі любоў да вёскі, да прыроды, да каранёў.

Вельмі хацелася б, каб гаспадары не захапляліся «карпаратыўным кірункам», каб яны не абмяжоўваліся толькі зарабляннем грошай. Каб прапаноўвалі больш цікавых, пазнавальных праграм.

Што тычыцца наступнага конкурсу, думаю, трэба пашыраць намінацыі, звузіць крытэрыі і ў члены журы ўключыць сёлетніх гаспадароў сядзіб-пераможцаў.

*Кірыл КРАСНІЦКІ, галоўны эканаміст Упраўлення карпаратыўнага бізнэсу ТАА «Белаграпрамбанк», член аргкамітэта конкурсу «Лепшая сядзіба года»:*

## «МУЖЧЫНСКІ» АДПАЧЫНАК МНЕ БОЛЬШ ДАСПАДОБЫ

— На сёння банк пракрэдытаваў 235 суб'ектаў аграэкатурызму на суму парадку 8 млрд беларускіх рублёў. Найбольшая колькасць крэдытаў выдадзена Віцебскай (працэнтаў трыццаць ад агульнай сумы), Гродзенскай і Мінскай абласцям.

Я быў уключаны ў аргкамітэт конкурсу, і тое, што ўбачыў, калі мы прыязджалі на сядзібы, мяне вельмі задаволіла. Сапраўды, сродкі банка ідуць па прызначэнні. Людзі праводзяць на свае сядзібы гарачую ваду, усталёўваюць сантэхніку, добраўпарадкоўваюць тэрыторыю, каб дасягнуць пэўнага стандарту якасці паслуг.

Добра, што сядзібы розныя, што кожны турыст можа знайсці сваю. Мне, напрыклад, вельмі спадабалася сядзіба «Пясчаны плёс» у Магілёўскай вобласці. Ёсць сядзібы, якія больш будуць даспадобы жанчынам, а ёсць — мужчынскія, якія прапануюць шыкоўную рыбалку, адасобленасць і нічога лішняга: гарачая вада, сучасны санвузел, ложак... Я застаўся б у такой з задавальненнем.

*Сяргей СЕРГАЧОЎ, доктар архітэктуры, прафесар, член журы конкурсу «Лепшая сядзіба года»:*

## «ГЭТА ЎЖО НЕ ПРОСТА ДОМ»

— Я гляджу на ўсю гэту ідэю як на пачатак вялікага шляху. Сядзібы імкнуся ацаніць з пункту погляду перспектывы. За кожнай стаіць канкрэтны чалавек. Бывае, што сядзіба размешчана няўдала. Жаданне зрабіць з яе турыстычны аб'ект ёсць, а магчымасцяў — няшмат. Але гэты пачатковы этап людзі выкарыстоўваюць, каб выпрацаваць нейкія стартавыя пазіцыі: у выглядзе вопыту, сродкаў, пабудоў. Галоўнае ў сённяшняй сітуацыі, каб ідэі жылі, і каб з'яўляліся людзі, якія гатовы за гэта брацца. Таму, я думаю, пакуль рана ставіць для сядзібаў занадта высокую планку патрабаванняў.

Аднак, як архітэктар я хачу звярнуць увагу гаспадароў на тое, што іх дом — гэта ўжо не проста іх уласны дом, у якім яны ведаюць усе небяспечныя і нязручныя месцы. Гэта будынак, у якім бяспечна і камфортна павінны адчуваць сябе чужыя людзі. Не будзеш жа ўвесь час стаяць ля лесвіцы і кожны раз папярэджваць: «Асцярожна! Тут высокая прыступка!», альбо «Нізкі праём!», альбо «Слізкая падлога!» і гэтак далей. Адна справа, калі чалавек стварае асяроддзе для сябе, і крыху іншая — калі для чужых людзей, за якіх ён нясе адказнасць.

Ёсць цудоўныя сядзібы, якія, здаецца, ужо дасягнулі вяршынь. Але праз некаторы час і яны пажадаюць зрабіць наступны крок. Бо таптанне на месцы не задаволіць гэтых людзей, яны — людзі творчыя. Рашыць, куды зрабіць гэты крок, ім дапаможа грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы», бо тут акумулююцца ідэі, нешта фільтруецца, нешта прапрацоўваецца.

Вялікую справу робіць сёння Белаграпрамбанк. Ён не толькі выдаткоўвае сродкі, але і аддае шмат часу, сілаў. Банк — пакуль адзіная структура, якая ў гэтай сферы суправаджае чалавека і рэальна дапамагае яму ўвасабляць яго ідэі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ОАО «БРЕСТСКИЙ РАДИОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

Наблюдательный совет ОАО «БРТЗ» сообщает, что 26 марта 2009 года в помещении заводоуправления по адресу: г. Брест, ул. Московская, 248 состоится общее собрание акционеров

**Повестка дня:**

1. Отчет директора завода об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2009 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2008 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2009 год.
7. Об утверждении изменений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

**Начало собрания в 14.00.**
**Начало регистрации в 13.00.**

Акционеры могут участвовать в собрании лично или через своих представителей, имеющих нотариально оформленные доверенности. При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность.

**Справки по тел. 8 0162 42 14 05, факс 42 51 59.**

УНН 200273907. **Наблюдательный совет.**

## ОАО «БРЕСТСКИЙ КОМБИНАТ СТРОИТЕЛЬНЫХ МАТЕРИАЛОВ»

сообщает, что 26 марта 2009 года состоится очередное собрание акционеров.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

